ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Настаўніцкая газета

Выходзіць з 20 снежня 1945 года | №49 (4407) СЕРАДА, 8 чэрвеня 1994 года | Кошт па падпісцы — 20 руб., у розніцу — 100 руб.

НГ-ІНФАРМ

СТАЎКА НА КАМП'ЮТЭРЫ

Сучасная адукацыя патрабуе сучаснай тэхналогіі. Найбольш эфектыўным і магутным сродкам з'яўляюцца камп'ютэры як інструмент пазнання свету. Электронны падручнік, інфармацыйна-пошукавыя сістэмы базы даных ведаў, экспертныя сістэмы — вось тыя элементы інфармацыйных тэхналогій, якія сёння павінны выкарыстоўвацца ў сістэме адукацыі. Таму камп'ютэрызацыя навучальных устаноў — задача сённяшняга дня.

Калі ў вышэйшых навучальных установах у гэтым напрамку зроблена многае, то гэтага нельга сказаць пра сярэднія школы, якіх у краіне больш як 5 тысяч.

Днямі міністр адукацыі Віктар Гайсёнак пабываў на мінскім заводзе "Электроніка". Дырэктар прадпрыемства В.Вярбіцкі, галоўны інжынер В.Талкачоў, намеснік дырэктара па маркетынгу і збыту В.Падольскі расказалі, у якіх нялёгкіх умовах працуе калектыў рытмічна, без скарачэння рабочых. На заводзе выпускаюцца камп'ютэры, электронныя часы, настольныя і насценныя тэлефонныя апараты, электронныя тэрмометры. Па сваёй якасці прадукцыя адпавядае сусветным стандартам, можа выйсці на сусветны рынак. Аднак было адзначана, што на заводзе яшчэ не навучыліся рэалізоўваць прадукцыю, даходзіць да спажыўца. Палепшыць варта і рэкламу. Адміністрацыя завода можа заключыць дагаворы з аддзеламі адукацыі па рэалізацыі прадукцыі, а 10 працэнтаў ад выручкі застаецца на патрэбы навучальных устаноў.

Міністр адукацыі азнаёміўся з работай камп'ютэраў, якія могуць выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе. У прыватнасці, настаўнік са свайго рабочага месца можа кантраляваць работу класа, кожнага вучня і г.д. Былі ўнесены заўвагі і прапановы па ўдасканаленні камп'ютэраў.

Віктар Анатольевіч Гайсёнак прапанаваў адміністрацыі завода абсталяваць камп'ютэрны клас у адной з сельскіх сярэдніх школ Мінскага раёна, а таксама ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі з мэтай прапаганды і ўдасканалення камп'ютэрнай сістэмы.

Маркуецца пастаўку камп'ютэраў у школы праводзіць цэнтралізаваным метадам, а гэта патрабуе цэнтралізацыі бюджэтных сродкаў. Пытанні набыцця камп'ютэраў будуць яшчэ дэталёва абмеркаваны.

Міхась АНІСЕНКА.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

КОРАТКА

У Беларускім педагагічным і Беларускім дзяржаўным універсітэтах уводзяцца новыя спецыяльнасці. Гэта "Грэчаская і лацінская мова і літаратура", "Сацыяльная работа", "Культуралогія", "Экалогія", "Дзіцячая і юнацкая журналістыка", а таксама "Літаратурная работа".

* * *

28 чэрвеня ў Горках Магілёўскай вобласці пачне работу краязнаўчая канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

* * *

Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны наведала дэлегацыя з універсітэта горада-пабраціма Клерман-Феран. Мэта візіту французскай дэлегацыі — адабраць некалькі студэнтаў эканамічнага факультэта для аднагадовай вучобы ў Францыі. Адбор праходзіў на конкурснай аснове. У выніку трое студэнтаў запрошаны на вучобу ў Клерман-Феран.

* * *

Сёлета пры паступленні ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію абітурыентам неабходна будзе здаваць экзамены па беларускай мове і літаратуры.

* * *

У верасні ў Брэсце на базе гарадскога Дома дзіцячай і юнацкай творчасці плануецца адкрыць сацыяльна-псіхалагічны цэнтр для моладзі, а на базе інтэрната спартыўнай школы №5 — прытулак для непаўналетніх.

* * *

Жыхарам Смаргоні ва ўзросце да 18 гадоў, згодна з рашэннем гарсавета, забараняецца з 23 да 6 гадзін раніцы знаходзіцца на вуліцах горада, у дварах і пад'ездах дамоў, а таксама ў іншых грамадскіх месцах без суправаджэння бацькоў.

* * *

У Смалявіцкім раёне нямала зроблена па выкананні Закона аб мовах. Тут распрацавана доўгатэрміновая праграма "Спадчына". Выконваючы яе, на дзяржаўную мову пераведзена навучанне і выхаванне ва ўсіх пачатковых класах школ раёна, дзіцячых садках і пазашкольных установах.

* * *

Гомельскі політэхнічны інстытут адзначыў 25-гадовы юбілей. За гэты перыяд навучальная ўстанова падрыхтавала больш як 8 тысяч спецыялістаў.

Міхась АНІСЕНКА.

ПА РОДНЫМ КРАІ

ДРУГОЕ СВЯТА Ў ВЕРАСНІ

Першага верасня, як вядома, штогод адзначаецца Дзень ведаў. А сёлета чацвёртага верасня — у першую вядзелю месяца — упершыню ў Беларусі будзе святкавацца Дзень беларускага пісьменства і друку.

Ва указе Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь адзначаецца, што гэта свята ўстаноўлена ў мэтах павышэння прэстыжу пісьменства і друку як асновы шматвяковай нацыянальнай культуры, дзеля далейшага памнажэння яе здабыткаў, узмацнення яе ролі і значэння ў духоўным жыцці грамадства.

ДВОЙКІ ВЕДАМСТВАМ

Ход выканання многімі міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Закона аб мовах нельга прызнаць здавальняючым — гаворыцца ў пастанове Прэзідыума Вярхоўнага Савета "Аб мерах па забеспячэнні своечасовага выканання Закона Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь".

Савету Міністраў даручана сістэматычна разглядаць выкананне заканадаўства аб мовах. Акадэміі навук сумесна з міністэрствамі адукацыі, культуры і друку і іншымі зацікаўленымі органамі і ўстановамі прапанавана да 1 верасня 1994 года ўтварыць Рэспубліканскі навукова-каардынацыйны савет па пытаннях правядзення дзяржаўнай моўнай палітыкі.

ХТО НАЦІСНЕ НА ТАРМАЗЫ?

Сёння адзіны рэальны паратунак для нас — аднаўленне эканамічных сувязей з Расіяй і іншымі краінамі СНД, як мага хутчэйшае асваенне рынкаў Расіі ў першую чаргу — такім бачыць шлях выхаду Беларусі з глыбокага сацыяльна-эканамічнага крызісу Старшыня Вярхоўнага Савета М.І.Грыб.

Выступаючы перад працоўным калектывам гродзенскага завода "Радыёпрыбор", спікер парламента сказаў, што "ў нас сёння невясёлыя справы": за апошні месяц інфляцыя дасягнула ўзроўню 43 працэнтаў, цэны на спажывецкія тавары і паслугі ў параўнанні са снежнем 1993 года ўзраслі ў 2,4 раза. Адзіна вырашальнай задачай бліжэйшага часу М.Грыб назваў "тармажэнне і прыпыненне масавага абвалу сельскай і прамысловай вытворчасці".

"УСЁ САПСАВАЎ ЛУКАШЭНКА"

Старшыня Савета Міністраў Вячаслаў Кебіч і яшчэ тры кандыдаты на пасаду прэзідэнта — А.Дубко, В.Новікаў і А.Лукашэнка — спрабавалі дамовіцца аб каардынацыі дзеянняў у час прэзідэнцкай кампаніі і, па магчымасці, вылучэнні аднаго кандыдата.

Дзелячыся ўражаннямі аб гэтай гутарцы перад сустрэчай з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, якая адбылася ў Нясвіжы, В.Кебіч сказаў, што Дубко і Новікаў згадзіліся весці перамовы і нават блізка падышлі да ідэі стварэння кааліцыйнага ўрада, аднак усё сапсаваў Лукашэнка, заявіўшы, што будзе весці перагаворы толькі ў выпадку вылучэння кандыдатам непасрэдна яго.

СТАНІСЛАЎ ЗА СТАНІСЛАВА

У планах ініцыятыўнай групы Станіслава Шушкевіча, па словах Алега Трусава на прэс-канферэнцыі 1 чэрвеня, — выхад С.Шушкевіча ў другі тур выбараў.

Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады не выключыў магчымасці стварэння ў другім туры выбараў блока БСДГ, АДПБ, ПНЗ і БНФ у падтрымку экс-спікера. У выпадку перамогі на прэзідэнцкіх выбарах С.Шушкевіча, зазначыў А.Трусаў, прэм'ер-міністрам новага ўрада стане цяперашні галоўны банкір краіны Станіслаў Багданкевіч.

НГ-ІНФАРМ

ВЕСТКІ З ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

ЛЕКЦЫІ ПА РЫНАЧНАЙ ЭКАНОМІЦЫ

Спецыяльны курс лекцый прачытаны для студэнтаў і выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта пастаянным прадстаўніком Міжнароднага Валютнага Фонду (МВФ) Вілемам Мідэлкаопам. Курс меў мэтавы характар, усе яго тэмы былі папярэдне абмеркаваны і ўзгоднены з рэктарам універсітэта і кафедрай міжнародных эканамічных адносін. Пастаянны прадстаўнік МВФ улічыў літаральна ўсе прапановы. Яго лекцыі былі прысвечаны розным аспектам рыначнай эканомікі краін Захаду, параўнальнаму аналізу эканамічных праблем краін Заходняй Еўропы і Беларусі, актуальным праблемам развіцця нашай краіны, яе сувязям з МВФ.

Вялікую цікавасць у слухачоў выклікалі лекцыі, прысвечаныя аналізу эканамічнай палітыкі дзяржавы на прыкладзе Галандыі, дзе пан Мідэлкаоп на працягу шэрагу гадоў быў міністрам эканомікі. На яго думку, гэта невялікая заходнееўрапейская краіна па шэрагу эканамічных параметраў вельмі нагадвае Беларусь. І многія сучасныя эканамічныя праблемы Галандыі — датаванне сельскай гаспадаркі, суднабудавання і да т.п. — падобныя да цяперашніх праблем нашай эканомікі.

Некалькі лекцый прадстаўнік МВФ прысвяціў выкладанню сваіх поглядаў на сучасную эканамічную сітуацыю ў Беларусі, праблеме магчымага грашовага саюза з Расіяй.

Трэба адзначыць вельмі ўважаны і аргументаваны падыход лектара да ўсіх выкладаемых пытанняў. Ён не ўступаў у безвыніковыя палітычныя дыскусіі, а імкнуўся даць прафесійную ацэнку кароткатэрміновых і доўгатэрміновых вынікаў магчымых варыянтаў развіцця падзей, выявіць карэнныя праблемы цяперашніх эканамічных цяжкасцяў Беларусі.

Лектар звярнуў увагу на неабходнасць правядзення вельмі прадуманай крэдытнай палітыкі такой невялікай дзяржавы, як наша. Паводле яго ацэнкі, нецентралюемая крэдытная палітыка можа прывесці да "скупкі" найбольш прыбытковай і перспектыўнай часткі эканомікі Беларусі яе крэдыторамі на працягу некалькіх гадоў.

Цэльны курс лекцый, чытаемы замежным спецыялістам такога высокага класа, несумненна, вельмі неабходны студэнтам. Невыпадкова курс лекцый пана Мідэлкаопа быў вельмі папулярны, і асабліва сярод студэнтаў міжнародных эканамічных спецыялізацый.

Карыснымі гэтыя лекцыі аказаліся і для выкладчыкаў універсітэта як у змястоўным, так і ў арганізацыйна-метадычным плане.

Лектар будаваў заняткі ў актыўным дыялогавым рэжыме, пярэдка спецыяльна завастраючы асабліва спрэчныя праблемы.

На занятках у яго заўсёды былі падрыхтаваны для кожнага слухача пакет дапаможных матэрыялаў, якія ўтрымліваюць тэзісны пераказ ключавых ідэй лекцый, графікі, табліцы, схемы, артыкулы з газет і часопісаў, што ілюструюць і паглыбляюць змест выкладаемага матэрыялу.

Водгукі студэнтаў і выкладчыкаў аб курсе лекцый дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што менавіта такая форма ўдзелу замежных спецыялістаў у навучальным працэсе ў вышэйшай школе з'яўляецца найбольш выніковай. Час спарадычных выступленняў "залётных" прафесараў, якія выкладаюць, як правіла, агульнавядомыя ісціны, мінуў.

Неабходны прадуманы адбор і сістэмнае запрашэнне высокакваліфікаваных замежных педагогаў і спецыялістаў-практыкаў для чытання мэтавых курсаў лекцый. Вядома, зрабіць гэта ва ўмовах бядотнага фінансавага становішча ВНУ вельмі няпроста, але да гэтага трэба імкнуцца. Уяўляецца мэтазгодным арганізацыя пад эгідай Міністэрства адукацыі семінара або канферэнцыі прадстаўнікоў ВНУ краіны, прысвечанай абагульненню і аналізу вопыту прыцягнення замежных спецыялістаў да чытання лекцый і ўдасканалення навучальнага працэсу.

Сяргей КРЫЧЭЎСКІ,
кандыдат эканамічных навук, магістр дзелавога адміністравання, загадчык кафедры БДЭУ.

ДНІ КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

На філалагічным факультэце Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны прайшлі дні кафедры беларускай мовы, якія былі прысвечаны 25-годдзю навучальнай установы.

Яны пачаліся сустрэчай з настаўнікамі роднай мовы і літаратуры — выпускнікамі кафедры. Іх цёпла віталі сённяшнія студэнты, якія чыталі вершы, спявалі, танцавалі. А затым адбылася шчырая размова са студэнтамі, з выкладчыкамі аб праблемах выкладання мовы і літаратуры ў школах горада, аб налёгкіх шляхах нашага адраджэння. Выказана агульнае пажаданне, каб зрабіць такія сустрэчы традыцыйнымі. Несумненна, што яны будуць садзейнічаць умацаванню яшчэ больш цесных сувязей кафедры са школай.

Прайшлі таксама студэнцкія навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу, вядомаму нашаму земляку, акадэміку- мовазнаўцу, ураджэнцу вёскі Данілаўка Светлагорскага раёна. Сцяпан Некрашэвіч у свой час быў віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі. Адбылася сустрэча з вучнямі 56-й школы, перад якімі выступілі загадчыца кафедры А.А.Станкевіч, загадчык кафедры беларускай культуры Д.Д.Паўлавец. Вучні з цікавасцю азнаёміліся з кабінетамі, бібліятэкай факультэта, а таксама з выставай "Палескія ўзоры", якая працавала на факультэце на працягу некалькіх дзён. Тут былі прадстаўлены прадметы быту і культуры Палескага краю, сабраныя студэнтамі-філолагамі ў час летніх дыялекталагічных экспедыцый.

На круглы стол "Мне сняцца сны аб Беларусі..." быў запрошаны добры знаўца гісторыі нашай Бацькаўшчыны Ц.Вострыкаў.

Л.КУЗЬМІЧ,
кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык ГДУ імя Ф.Скарыны.

ПАВЕДАМЛЯЕ ПРЭС-ЦЭНТР МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ

ШТО, ДЗЕ, КАЛІ

29 чэрвеня ў Пінску пройдзе пасяджэнне Міжведамаснай Рады па пытаннях дашкольнага выхавання. Парадак дня:

1. Аб перадачы ведамасных дашкольных устаноў на баланс мясцовых Саветаў.
2. Фізкультурна-аздараўленчая работа ў ведамасных дашкольных установах Пінска.

* * *

У чэрвені на факультэце кіруючых работнікаў школ і пазашкольных устаноў ІПКІПКРСА праводзяцца курсы:

3 30 мая па 25 чэрвеня — мастацка-эстэтычнае выхаванне ў дзяцей.

Курсы для метадыстаў і творча працуючых выхавацеляў дашкольных устаноў. Вывучаюцца канцэптуальныя падыходы да сістэмы мастацка-эстэтычнага выхавання дзяцей у Беларусі, пытанні методыкі выхавання і навучання дзяцей розным відам мастацкай дзейнасці, праводзяцца практыкумы па навучанні выхавацеляў арыгінальным відам мастацкай дзейнасці. На курсах запланаваны наведванні лепшых дзіцячых садоў Мінска.

3 30 мая па 25 чэрвеня — курсы для загадчыкаў дашкольных устаноў, якія раней праходзілі курсавую падрыхтоўку. Разглядаюцца шэраг праблем па навуковых асновах кіравання дашкольнымі ўстановамі, псіхалагічныя праблемы кіравання, блок пытанняў, прысвечаных нацыянальнаму адраджэнню.

3 1 па 14 чэрвеня — шляхі выкарыстання беларускіх народных традыцый у працэсе выхавання нацыянальнай свядомасці вучняў.

Прадугледжваецца паглыбленае вывучэнне фальклорнай спадчыны, агульнанацыянальнай традыцыйнай культуры, этнапедагогікі ў выхаваўчых, навучальных, дыдактычных мэтах. Слухачам будзе дадзена магчымасць сустрэцца са знакамітымі вучонымі, практыкамі, набыць метадычную літаратуру.

3 1 па 28 чэрвеня — заняткі лектараў па этнапедагогіцы і сямейным выхаванні.

Мэта — падрыхтоўка лектараў па пытаннях адраджэння сям'і, як першаснага выхаваўчага калектыву. Разглядаюцца праблемы выхавання дзяцей у сучаснай сям'і, разнастайныя пытанні этнапедагогікі, сацыяльнай педагогікі. Да ўдзелу ў працы курсаў прыцягнуты вядомыя вучоныя, прадугледжваецца азнаямленне з вопытам работы і з навінкамі педагагічнай літаратуры.

На курсы запрашаюцца педагогі ўсіх тыпаў школ і пазашкольных устаноў, аддзелаў адукацыі, інстытутаў удасканалення настаўнікаў.

3 6 па 25 чэрвеня — экалагічнае выхаванне і асновы жыцця, здароўя дзяцей.

Курсы для метадыстаў і творча працуючых выхавацеляў дашкольных устаноў. Слухачы будуць азнаёмлены з асновамі экалагічнага выхавання, будзе дадзена статыстычная інфармацыя пра здароўе дзяцей у Рэспубліцы Беларусь. Запланаваны заняткі ў Цэнтры па экалагічным выхаванні.

3 6 чэрвеня па 2 ліпеня — фізічнае выхаванне і асновы жыцця, здароўя дзяцей.

Курсы для выкладчыкаў і метадыстаў педвучылішчаў і каледжаў.

Віктар ІЎЧАНКАЎ, вядучы эксперт упраўлення аналітычнай работы і перспектыўнага развіцця.

2160 рублёў — і ў вас ніякіх праблем з найбольш поўнай аператыўнай педагагічнай інфармацыяй!

Вы хочаце ведаць пра змены ў навучальных планах і праграмах да новага навучальнага года, пра выхад у свет новых падручнікаў і дапаможнікаў?

Вас цікавяць новыя ідэі ў адукацыі і выхаванні, якія дапамагаюць павысіць эфектыўнасць навучальна-выхаваўчага працэсу?

Вам патрэбны кваліфікаваныя кансультацыі вядомых педагогаў-практыкаў, навукоўцаў, метадыстаў, псіхолагаў?

Выпісвайце "Настаўніцкую газету"!

Нагадваем, што падпіска заканчваецца 15 чэрвеня.

У Вашым распараджэнні для афармлення падпіснай квітанцыі толькі тыдзень!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету 63867 (індэкс выдання)

«Настаўніцкая газета» Колькасць камплектаў

на 199 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 63867 (індэкс выдання)

«Настаўніцкая газета»

Кошт: падпіскі ___руб.___коп.; перавадрасоўкі ___руб.___коп. Колькасць камплектаў

на 199 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

НГ-ІНФАРМ

НАПЯРЭДАДНІ

БЕЗ ІЛЮЗІЙ

Політэхнічны тэхнікум у Маладзечне — бадай, самая значная навучальная ўстанова горада і адзіная ў Беларусі, якая рыхтуе спецыялістаў для харчовай прамысловасці і сістэмы хлебапрадуктаў. Акрамя таго, тут рыхтуюць спецыялістаў па радыёапаратабудаванню і тэхнічнаму абслугоўванню станкоў з праграмным кіраваннем і робататэхнічных комплексаў. Пра яго работу наша газета расказвала гады два таму. І вось цяпер наш карэспандэнт зноў наведаў яго, меў гутарку з членам прыёмнай камісіі Ліліяй Мікалаеўнай Іванкевіч, цікавіўся пра асаблівасці прыёму ў гэтым годзе. Вось што яна расказала:

— Нягледзячы на жорсткія ўмовы рынку, тэхнікум працягвае пасіпхова дзейнічаць, рыхтуе моладзь на бясплатнай аснове. Хаця, між іншым, сёлета плануецца набраць на камерцыйнай аснове адну групу па спецыяльнасці "Тэхналогія захавання і перапрацоўкі расліннай сыравіны".

Апроч таго, калі знойдуцца жадаючыя, фундатары, прадпрыемствы, тэхнікум упершыню пачне падрыхтоўку спецыялістаў па індывідуальных навучальных планах, якія будуць адпавядаць профілю вытворчасці прадпрыемства. Перавага такой падрыхтоўкі ў тым, што спецыялістам не трэба будзе перавучацца на прадпрыемстве, прыстасоўвацца да новых умоў. Значыць, фундатарства будзе эканамічна апраўданым.

Цяпер у тэхнікуме вядзецца работа па стварэнні падрыхтоўчых курсаў у дапамогу "Абітурыенту-94". У іх работе будуць задзейнічаны самыя лепшыя педагогі. На курсах абітурыенты змогуць атрымаць неабходныя веды па профілюючых у тэхнікуме дысцыплінах — матэматыцы, беларускай мове і хіміі.

Асаблівая ўвага ў работе прыёмнай камісіі звяртаецца на тое, каб абітурыент лішча да ўступных экзаменаў мог добра ўзважыць свой выбар, дасцца падрабязная інфармацыя па расшыфроўцы ўсіх спецыяльнасцей, расказвецца пра тое, дзе выпускнік будзе працаваць пасля атрымання дыплома. У яго адразу ствараецца ўяўленне аб сваёй перспектыве, падстаў для ілюзій не застасцца.

Гэта работа ажыццяўляецца задоўга да прыёму дакументаў. Па традыцыі, 21 мая, у Дзень тэхнікума, які лішча называюць Днём адкрытых дзвярэй, працуе кансультацыйны пункт для абітурыентаў. У вестыбюлі ўстаноўлены маляўнічыя, пастаянна дзеючыя стэнды з неабходнай інфармацыяй. Кожны жадаючы мае магчымасць пазнаёміцца з навучальнымі кабінетамі і лабараторыямі, спартыўнымі залямі, з культурным жыццём калектыву, яго мастацкай і тэхнічнай творчасцю.

І апошні штрых: кіраўніцтва дапамагае ўсім сваім выпускнікам уладкавацца на работу па атрыманай спецыяльнасці, што ў сённяшні час ніяк нельга скідаць з рахунку.

П.ЮДО.

ПАДЗЯЛЮСЯ З ВАМІ

І канцэрт па-французску

Пачаліся канікулы, а за плячыма настаўнікаў і вучняў — напружаны, насычаны навучальны год, які патрабаваў поўнай сканцэнтраванасці і аддачы.

Але школьнае жыццё — гэта не толькі ўрокі. У нас у школе №39 Гомеля было шмат цікавых падзей і мерапрыемстваў. Каб зацікавіць дзяцей вучобай, даць іх магчымасць правяць свае веды ў тым або іншым прадмеце, праводзіліся прадметныя тыдні пад дэвізам "Веды — аснова жыцця і працы". Агульнымі намаганнямі вучняў і настаўнікаў праведзена імпрэза "Шчаслівы выпадак" па хіміі і біялогіі, матэматычны калейдаскоп, клуб весялых і знаходлівых знаўцаў матэматыкі, канцэрт па французскай мове, у якім удзельнічалі не толькі вучні сярэдніх і старэйшых класаў, але і самыя маленькія — першакласнікі і другакласнікі, якія таксама вывучаюць французскую мову.

Вучні нашай школы бралі ўдзел у гарадскім конкурсе рэфератаў на тэму "Захаваем бацькаўшчыну", пісалі сачыненні "Чырнобыль у маім лёсе" і "Наш гонар, наш боль". Акрамя таго, па фізіцы і хіміі, біялогіі і астраноміі праводзіліся розныя віктарыны, конкурсы эрудытаў.

Да кожнага прадметнага тыдня мы выпускалі насценгазеты, часцей за ўсё на беларускай мове. Усё гэта паглыбіла веды вучняў, у многіх выклікала цікавасць да розных прадметаў.

Мы добра папрацавалі, а зараз будзем адпачываць, набіраецца сіл да будучага навучальнага года.

Вольга ЗАЙКІНА,
вучаніца 10 класа школы
№39 Гомеля.

ВАЗЬМІЦЕ НА ЗАМЕТКУ

Адбудзецца канферэнцыя

3—4 красавіка 1995 года ў Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытуце адбудзецца Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ШКОЛА: ГІСТОРЫЯ, СУЧАСНАСЦЬ, ПЕРСПЕКТЫВЫ".

На канферэнцыі плануецца абмеркаванне наступных пытанняў: філасофія адукацыі і нацыянальная ідэя: пошукі ўласнай парадыгмы; гісторыя беларускай нацыянальнай школы; сучасны стан нацыянальнай школы і перспектывы яе развіцця; актуальныя пытанні беларускамоўнага выкладання гуманітарных і прыродазнаўчых дысцыплін; праблемы стварэння беларускамоўнага асяроддзя ў навучальных установах; месца беларусазнаўства ў навучальным працэсе, ва ўмацаванні нацыянальнай самасвядомасці і выхаванні культуры міжнацыянальных адносін; пытанні адукацыі этнічных меншасцяў Беларусі; шляхі задавальнення адукацыйных патрэб беларускай дыяспары.

Да канферэнцыі плануецца выданне зборніка матэрыялаў. Тэзісы дакладаў аб'ёмам 1—4 старонкі машынапіснага тэксту, надрукаваныя праз два інтэрвалы на беларускай мове, дасылайце, калі ласка, у 2-х экземплярах да 3 кастрычніка 1994 г. на адрас: 224665, Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21. Брэсцкі педінстытут. Яцкевічу С.А. Паколькі атрыманыя матэрыялы будуць перадрукоўвацца, прытрымлівацца пэўных норм іх афармлення неабавязкова, але аргкамітэт просіць усіх аўтараў паклапаціцца пра змястоўную адпаведнасць дасылаемых матэрыялаў тэматыцы канферэнцыі, а таксама пра іх стылістычную і арфаграфічную дакладнасць. Рэдкалегія пакідае за сабой права адбору матэрыялаў і (пры неабходнасці) іх рэдагавання. Да тэзісаў трэба прыкласці аўтарскую даведку з указаннем імя і прозвішча, вучонай ступені і звання, месца працы і пасады, адраса і тэлефона.

Тэлефоны для даведак: 625-14, 333-44, 333-42 (код Брэста: 8-01622).

ЛЕТНІЯ ТУРБОТЫ

І САБЕ, І ЛЮДЗЯМ

Лета прынесла новыя клопаты вучнёўскім працоўным аб'яднанням.

У нашым раёне дзейнічае шмат розных па профілі працоўных аб'яднанняў школьнікаў. Гэта традыцыйныя вучнёўскія вытворчыя брыгады, звенні юных жывёлаводаў і коннатаў, будаўнічыя і рамонтныя брыгады, атрады па добраўпарадкаванні і азеляненні жылых масіваў, школьныя лясніцтвы.

Такім чынам, у большасці школ ужо назапашаны шматгадовы вопыт эканамічнага выхавання вучняў у працэсе грамадска карыснай прадукцыйнай працы. Найбольш эфектыўнымі зарэкамендавалі сябе брыгадныя формы арганізацыі вучнёўскай працы, якія даюць магчымасць школьнікам на практыцы асвоіць элементы гаспадарчага разліку.

Перавод на падрад пачынаўся год шэсць таму. Першымі пачалі асвойваць гаспадарчы разлік у працэсе працы па брыгадным падрадзе школьнікі Ульскай школы. Аплата іх працы была дагаворная. Зарплату вучні атрымоўвалі па дзяржаўных расцэнках. Прыбытак за вырошчванне кармавых буракоў у першы год быў размеркаваны паміж юнымі паляводамі ў залежнасці ад індывідуальнага працоўнага ўкладу.

Сярод лепшых калектываў, якія працуюць на падрадзе — вучнёўскія вытворчыя брыгады Бешанковіцкай школы №1, Бачэйкаўскай, Астравецкай, Бешанковіцкай дапаможнай школы-інтэрната, Свячанскай, Палуазёрскай сярэдняй і іншых школ.

Характэрна, што даход з пасяўных плошчаў з году ў год узрастае. Спашлюся на перадапошнія тры. Так, у 1990 годзе школьныя вытворчыя брыгады ў сумарным вылічэнні атрымалі даходу 22400 рублёў, у наступным ён склаў 34700 рублёў, а ў 1992-м (у новых цэнах) — 9 мільёнаў 200000 рублёў. У мінулым сельскагаспадарчым годзе даход, атрыманы школьнымі вытворчымі брыгадамі, перавысіў 14 мільёнаў рублёў.

Карацей кажучы, арэндны і брыгадны падрады апраўваюць сябе ва ўмовах пераходу да рыначных адносін, што з'яўляецца рэзервам папаўнення сямейнага бюджэту за кошт заробкаў дзяцей. Акрамя таго, брыгады за кошт атрымання звышпланавай прадукцыі пастаўляюць бульбу, агародніну, садавіну і мяса ў школьныя сталовыя.

Як правіла, пад кіраўніцтвам эканамістаў базавых гаспадарак вучні распрацоўваюць тэхналагічныя карты па вырошчванні культур, на аснове такіх карт вылічваюць ліміты затрат на вытворчасць прадукцыі і вышукваюць магчымасці павышэння рэнтабельнасці сваёй працы. Гэта ўласціва кожнаму вучнёўскаму вытворчаму калектыву.

Для ілюстрацыі спашлемся на такі прыклад. Вучнёўская вытворчая брыгада школы №1 Бешанковічаў таксама працуе ва ўмовах арэнднага падраду. У дагаворы, заключаным з базавай гаспадаркай, прадугледжана выдзяленне ў карыстанне брыгадзе зямлі, насення, угнаенняў, гаруча-змазачных матэрыялаў, агавораны аб'ём вытворчасці прадукцыі і цэны на яе. Звышдагаворная прадукцыя рэалізуецца непасрэдна брыгадай.

У склад брыгады ўваходзяць 100 вучняў 8 — 10 класаў. Яны згрупаваны ў чатыры раслінаводчыя звяны, звяно механізатараў, два — жывёлаводаў. У распараджэнні брыгады 25 гектараў зямлі, на якой вырошчваюцца бульба і каранеплоды. Брыгада мае трактар МТЗ-80 з поўным наборам прычапнога і навясного інвентару. А пры патрэбе, у разгар сельскагаспадарчых работ, мясцовы калгас заўсёды апературна выдзяляе і дадатковую неабходную тэхніку.

Вынікі працы — плённыя: і высокі заработак непасрэдна юным земляробам, і запас прадуктаў для школьнай сталовай, у якой гарачыя абеды атрымоўваюць усе без выключэння вучні школы.

Есць і другі напрамак дзейнасці вучнёўскіх вытворчых брыгад, абумоўлены багатымі лясными масівамі ў раёне. Ахова і прымнажэнне лясных багаццяў з цягам часу перарасла ў асаблівы клопат многіх школьных лясніцтваў, якія таксама працуюць на аснове брыгаднага падраду.

Найбольш паказальным і тыповым з'яўляецца лясніцтва школы №2 Бешанковічу, якое мае статус структурнага падраздзялення мясцовага лясгаса.

Школьнае лясніцтва працуе ў адпаведнасці з навучальна-вытворчым планам, які штогод абмяркоўваецца і прымаецца на агульным сходзе юных лесаводаў школы і потым зацвярджаецца кіраўніцтвам. За школьным лясніцтвам замацавана 225 га лясных угоддзяў і 6 га пітомніка. У зімовасенні перыяд на базе навучальна-курсавога камбіната лясгаса (у абсталяваным сучаснымі тэхнічнымі сродкамі класе па лесаводству) з юнымі лесаводамі праводзіцца лесатэхнічная вучоба па 30-гадзіннай праграме, распрацаванай вядучымі спецыялістамі лясгаса. Праводзяцца заняткі па вызначэнні парод дрэў у падлеску, вымярэнні дыяметру ствалоў, іх вышыні, узросту дрэў пры дапамозе прыбораў.

На занятках праходзіць і эканамічнае выхаванне. Вучні знаёмяцца з такімі паняццямі, як прадукцыйнасць працы, якасць прадукцыі, даход, з эканомікай лесагаспадарчай вытворчасці. Эканамічнае выхаванне мае працяг і ў час працоўнай чвэрці ў летніку працы і адпачынку. Юныя лесаводы Бешанковіцкай школы сумесна з работнікамі лясгаса складаюць таксацыйныя апісанні лясного масіву, праводзяць даследчую работу па заданнях Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі і Бешанковіцкага лясгаса. Так, вывучаючы перадпасяўную падрыхтоўку насення елкі і ўплыў тэрмінаў высеву на рост саджанцаў у пітомніку, вучні выявілі, што лепшы спосаб падрыхтоўкі насення да пасеву — гэта вытрымка яго ў снезе (выхад стандартных саджанцаў у такім разе самы высокі — 93,6%), а лепшы тэрмін высеву — сярэдзіна красавіка. Вынікі такіх доследаў выкарыстоўваюцца ў лясгасе на прамысловай аснове.

Даследуючы травяністы покрыў лесу, юныя лесаводы памецілі на карце лясніцтва месцы рассялення рэдкіх і ахоўваемых раслін, правялі назіранні за асаблівасцямі іх цвіцення і плоданашэння. Гэта таксама служыць на карысць грамадству: наладжана ахова такіх участкаў і вызначаны навукова абгрунтаваныя нормы выкарыстання збору лекавых траў.

Сумесна з работнікамі лясгаса афармлены кабінет лесу, пракладзена экалагічная сцежка працягласцю два кіламетры. Апрача школьных заняткаў па профілі лесаводства, юныя лесаводы штогод праходзяць курс вучобы ў Беларускай малой лясной завочнай акадэміі. А на працягу лета на базе доследнага лясгаса працуе стацыянарны летнік працы і адпачынку школьнікаў.

Такім чынам, юныя лесаводы Бешанковічу штогод выконваюць значны аб'ём работ па доглядзе за пасадкамі лесу, лесанасенныя плантацыямі, па вырошчванні пасадачнага матэрыялу, нарыхтоўцы лекавай сыравіны, памнажэнні мурашнікаў. Іх праца аплачваецца па расцэнках, якія ўстаноўлены ў лясной гаспадарцы, з улікам КПУ кожнага юнага лесавода. У апошні год, да гонару вучняў, аб'ём выкананых імі работ у параўнанні з папярэднім перыядам павялічыўся на 36 працэнтаў.

І так у кожнай вытворчай школьнай брыгадзе, незалежна ад яе профілю: паляводчага, жывёлагадоўчага, лесаводчага, агароднінаводчага ці іншага.

Тамара КУХАРАВА,
спецыяліст Бешанковіцкага раённага
аддзела адукацыі.

ФОТАФАКТ

Спартзала гомельскай спецыялізаванай школы-інтэрната №5 выкліча захапленне нават у вопытных трэнераў і аматараў лёгкай атлетыкі. Трэнажоры, спартыўныя снарады, рыштунак прыцягваюць сюды вучняў усіх узростаў. А яшчэ прыцягвае дзяцей магчымасць займацца ў вопытнага, аўтарытэтнага педагога, выкладчыка фізкультуры Уладзіміра Ягоравіча Жарнакова.

Добрая спартыўная падрыхтоўка дапамагае многім выхаванцам лягчэй пераносіць прыроджаныя заганы. Заняткі фізкультурай у гэтай спецыялізаванай школе-інтэрнаце неаднаразова атрымлівалі высокую ацэнку спецыялістаў.

НА ЗДЫМКУ: заняткі з маладымі аматарамі лёгкай атлетыкі праводзіць У.Я.Жарнакоў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ВЫСТАВЫ

МОЖНА І ЎЗБРОІЦЦА

Няма сёння, відаць, чалавека, які не быў бы заклапочаны сваёй бяспекай у сувязі са значным ростам злачыннасці. З мэтай супрацьстаяння крымінальнаму асяродку Мінская гарадская асацыяцыя "Насельніцтва за бяспеку" і ладкуе выставы-кірмашы. Чарговая такая выстава адчынілася ўчора па адрасе: Мінск, праспект Машэрава, 23 (будынак "Белпрасета").

У яе адкрыцці бралі ўдзел аркестры паліцыі з германскага горада Саарбрукен і мінскай міліцыі. Удзельнікі гэтай міжнароднай выставы маюць магчымасць пазнаёміцца з навейшымі айчыннымі і замежнымі дасягненнямі ў галіне абароны людзей, уласнасці, каштоўнасцяў ад злачынных пасягненняў, супрацьпажарнай аховы, аховы працы і навакольнага асяроддзя.

Жадаючыя могуць тут жа атрымаць кансультацыі аб парадку набыцця, захоўвання і прымянення газавай зброі.

Удзельнікі выставы-кірмашу маюць права весці аптовы і штучны гандаль прадстаўленай прадукцыі, заключаць дамовы на яе паставу.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць па мінскіх тэлефонах: 23-63-20, 23-10-55, 23-08-93.

Мікола ГАЛАШАЎ,
кіраўнік прэс-цэнтра
асацыяцыі "Насельніцтва за
бяспеку".

ПОГЛЯД З-ЗА МЯЖЫ

Дараслі да Еўропы

У Віцебскі дзіцячы садзік №90, што на заводзе імя Кірава, прыехаў з Мюнхена філолаг Міхаэль Прэтцынгер. Ён мае намер дапамагчы дзеткам авалодаць нямецкай мовай, абмяняцца ідэямі, а заадно і падвучыцца рускай мове.

Спецыяліст застаўся задаволены арганізацыяй навучальна-выхаваўчага працэсу ў садзіку, які, па яго словах, пастаўлены тут на еўрапейскі ўзровень.

Уладзімір МІХНО.

НГ-ІНФАРМ

У ПАЗАШКОЛЬНЫХ УСТАНОВАХ

З пірагамі і гарбатай

Дзень сапраўднай весялосці і радасці прайшоў у Рэспубліканскім Палацы піянераў і школьнікаў. У госці да гаспадароў Палаца завіталі выхаванцы мінскай школы-інтэрната №3 для дзяцей-сірот, а таксама ветэраны піянерскага руху, былыя работнікі пазашкольных устаноў і піянерскіх летнікаў.

Дзяцей адразу запрасілі да сябе ў майстэрні кіраўнікі шматлікіх гурткоў, студый, такія, як "Залаты пеўнік", крынічка "Купалінка", "Весялушка", "Сувенірная", "Каўчэг", "Тэатральная", "Турысцкая". Ва ўсіх гэтых гуртках і студыях выхаванцы школы-інтэрната вучыліся працаваць з паперай, выраблялі цікавыя цацкі, мелі магчымасць паспяваць беларуская народныя песні, пагуляць у цікавыя гульні, памаляваць.

А потым усіх сваіх гасцей гаспадары Палаца частавалі смачнымі пірагамі, гарбатай з самавара. Ветэраны піянерскага руху расказалі дзецям пра традыцыі піянерскага жыцця мінулых гадоў, а піянеры — пра дзейнасць свайго атрада сёння.

Пасля гарбаты ўсе былі запрошаны ў канцэртную залу, дзе ўзорны ансамбль "Зорачка" выступіў перад гасцямі са сваёй новай канцэртнай праграмай. Свята весялосці і радасці скончылася дыскатэкай.

Ірына КУЛІКОЎСКІХ.

ЗЛЁТЫ

Хочаш — скачы, а хочаш — "Ката пячы"

Вось ужо 2 гады крочыць па Рэспубліцы Усебеларуская турысцка-краязнаўчая экспедыцыя навучэнцаў "Наш край". "Адраджэнне гістарычнай памяці", такую назву мае адзін з напрамкаў экспедыцыі.

25 — 28 мая ў Мінску адбыўся абласны злёт юных этнографаў-краязнаўцаў. У ім прынялі ўдзел больш як 150 школьнікаў амаль з усіх раёнаў вобласці. Для іх была падрыхтавана вельмі цікавая і разнастайная праграма.

У першы дзень удзельнікі злёту ў час пешаходнай экскурсіі пазнаёміліся з самай старажытнай часткай сталіцы Беларусі — Траецкім прадмесцем і Верхнім горадам. Увечары адбылося ўрачыстае адкрыццё злёту і сустрэча з вельмі цікавым калектывам народнага тэатра Беларускага педагагічнага універсітэта "Жывое слова".

Другі дзень юныя краязнаўцы правялі ў Заслаўі, дзе пасля экскурсійнай праграмы адбыўся фальклорны і этнаграфічны фестываль. Лепшыя дзіцячыя калектывы вобласці прадэманстравалі сваю творчасць, сваё ведание народных традыцый, абрадаў і свят. Заслаўскі Дом дзіцячай творчасці паказаў "Ката пячы" — традыцыйнае народнае свята Заслаўя. Фальклорна-этнаграфічны гурт Вузлянскай школы Мядзельскага раёна выступіў з "Вузлянскімі вячоркамі". Цікавую канцэртную праграму з беларускімі песнямі і карагодамі паказаў фальклорны калектыў Івянецкай школы Валожынскага раёна. Лебядзеўская школа Маладзечанскага раёна выступіла са сцэнічным паказам народнага свята "Юр'я".

Вялікую дапамогу ў правядзенні метадычнай часткі злёту аказалі Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі і Нацыянальны мастацкі музей Беларусі, дзе для ўдзельнікаў злёту былі праведзены змястоўныя экскурсіі і прачытаны лекцыі "Абрадныя святы і абрадны фальклор" і "Аб чым расказваюць старажытныя ўзоры Беларусі".

На злёце таксама адбыўся абмен вопытам работы. Аб сваёй працы па адраджэнні і захоўванні нацыянальных традыцый, па выхаванні ў падрастаючага пакалення любові і павагі да роднай зямлі расказалі А.С.Хіла — настаўніца Вузлянскай школы Мядзельскага раёна, М.І.Пратасевіч-Русовіч — настаўніца Пяршайскай школы Валожынскага раёна.

У час злёту на абласной станцыі юных турыстаў дзейнічала выстава матэрыялаў завочнай краязнаўчай віктарыны "Гераічныя старонкі Міншчыны", прысвечанай 50-годдзю вызвалення Беларусі.

Зоя ЛІПНІЦКАЯ,
дырэктар Мінскай абласной
станцыі юных турыстаў.

АГЛЯДЫ

ЭКСКУРС У ГІСТОРЫЮ

Настаўнікі гісторыі, беларускай мовы і літаратуры школ Фрунзенскага раёна Мінска многае робяць, каб даць школьнікам добрыя веды. Аддзел адукацыі, параўнуўшы правесці грамадскі агляд ведаў вучняў 9-х класаў па гісторыі Беларусі.

Грамадскі агляд ведаў праводзіўся ў тры этапы. І этап — унутрышкольны паміж усімі 9-мі класамі. Лепшы клас удзельнічаў у куставым, у якім гуртаваліся па 7—8 школ, а пераможцы куставога выходзілі ў III этап — выніковы, раённы. Дзень, калі праводзіўся заключны агляд ведаў, выліўся ў сапраўднае свята беларускай гісторыі, слова і мастацтва.

Прыемна было чуць дасканалыя і змястоўныя адказы ўдзельнікаў фіналу дзевяцікласнікаў сярэдніх школ №№156, 166, 128, 140, 127, якія на роднай мове расказвалі аб першых пасяленнях, старажытных гарадах на Беларусі, знакамітых асветніках Францыску Скарыне, Сымоне Будным, Еўфрасінні Полацкай, Міколе Гусоўскім, Д.-Марцінкевічу, Я.Купале і Я.Коласе, барацьбе нашых продкаў за незалежнасць, паўстаннях К.Каліноўскага, Тадэуша Касцюшкі, развіцці навукі і культуры, аб гістарычных помніках, што засталіся да нашых дзён, выказвалі ўласны светапогляд на рэчаіснасць.

Выдатна падрыхтаваліся ўсе дзевяцікласнікі, але лепшымі былі вучні сярэдняй школы №156, на другім месцы — вучні сярэдняй школы №166, на трэцім — вучні сярэдняй школы №127. Класныя калектывы і настаўнікі адзначаны граматамі і падарункамі.

Клаўдзія МІНАКОВА.

Жаночая гімназія. Першая ў Мінску

ПРА ШТО МАРЫЦЬ ПЕДАГАГІЧНЫ КАЛЕКТЫЎ СТАЛІЧНАЙ ШКОЛЫ №202

У новым мінскім мікрараёне Уручча-6 усяго дзве школы — №202 і №203. "Школа с эстэтычным ухілам" — напісана залатымі літарамі на дошцы ля ўваходу ў 202-ю. Давайце зазірнём у яе светлыя сцены.

Раён Уручча-6 засяліўся тры гады таму. І быць бы школе №202 звычайнай — як правіла, да школ у раёнах-новабудоўлях не прад'яўляюць павышаных патрабаванняў вышэйстаячыя інстанцыі, ім даецца гадоў пяць, каб стаць на ногі. Але дырэктар Яўгенія Рыгораўна Сачук вырашыла не чакаць пяць гадоў, а дабілася статуса школы з эстэтычным ухілам. Разумная, эрудзіраваная, энергічная яна здолела захапіць сваёй ідэяй і малады педагагічны калектыў, у якім падабраліся людзі, якія творча думаюць, разумеюць, што "проста" школа — гэта ўжо дзень учарашні.

У праграму навучання, акрамя асноўных прадметаў, былі ўключаны прафілюючыя: выяўленчае мастацтва і мастацкая праца, музыка і спевы, рытміка і танец, а таксама вывучэнне англійскай мовы, пачынаючы з 1-га класа.

Эстэтычны накірунак зрабіў школу прывабнай, вядома, у першую чаргу для дзяўчынак (суседняя №203 мае ў сваёй аснове праграмы паглыбленага вывучэння фізікі і радыётэхнікі). Тады і з'явілася ў Яўгеніі Рыгораўны задума аб стварэнні жаночай гімназіі.

Звернемся да гісторыі. Упершыню навучальныя ўстановы для дзяўчынак у Беларусі былі створаны ў 60-х гадах мінулага стагоддзя пад уплывам грамадзянскага руху прагрэсіўных педагогаў. У 1868 г. у Мінскай губерні было адкрыта 7 жаночых пансіёнаў. У сярэдзіне 90-х гадоў у Беларусі было 7 мужчынскіх і 1 жаночая гімназія — у Гомелі. Вучыліся ў гэтых установах у асноўным дзеці дваран, свяшчэннікаў, чыноўнікаў, буржуазіі, і зусім мала дзяцей найбольш заможных сялян.

У цяперашні час у Беларусі ёсць усяго толькі адна жаночая гімназія ў Жодзіне, створаная на базе вячэрняй школы. А ў Мінску ўсяго ў некалькіх школах ёсць класы з раздзельным навучаннем хлопчыкаў і дзяўчынак, але асобнай жаночай гімназіі пакуль няма ніводнай.

Як бачым, пераймаць вопыт па стварэнні жаночай гімназіі адміністрацыі і педагагічнаму калектыву практычна не было ў каго.

Шмат энергіі і душэўных сіл давялося затраціць Яўгеніі Рыгораўне, каб адшукаць і прыцягнуць да работы ў школе спецыялістаў, цікавых, таленавітых педагогаў. Гімназія ж — гэта больш высокі ўзровень ведаў і настаўнікаў, і вучняў. У 1993-94 навучальным годзе ў школе былі адкрыты эксперыментальныя класы дзяўчынак у 1-х, 5-х, 6-х, 7-х, 8-х і 10-х класах (па адным ў кожнай паралелі). Адміністрацыя распрацавала для іх новы навучальны план. У праграму былі ўключаны дадаткова такія прадметы для старэйшых класаў, як сусветная літаратура, сусветная мастацкая культура, народазнаўства, працоўнае (прафесійнае) навучанне. На ўроках працы дзяўчынкі вучацца вязаць кручком і на спіцах, кроіць, шыць, а таксама вывучаюць рамёствы Беларусі, кулінарыю, нацыянальную беларускую кухню. У 10—11-х класах дзяўчынкі могуць набыць прафесію сакратар-машыністкі з веданнем замежнай мовы, а таксама праходзяць медыцынскую падрыхтоўку.

Першамайскі райвыканкам падтрымаў распачаты эксперымент, выдзеліўшы дадатковыя сродкі, якія дазволілі павялічыць стаўкі настаўнікаў, што працуюць у класах дзяўчынак, на 15 працэнтаў.

Аб раздзельным навучанні хлопчыкаў і дзяўчынак шмат гаварылася і на старонках друку, і ў радыё- і тэлеперадачах. Прывяду толькі некаторыя даныя з вынікаў працаваўшай у школе кандыдата псіхалагічных навук, дацэнта кафедры псіхалогіі інстытута павышэння кваліфікацыі С.Залескай, а таксама анкетавання бацькоў і вучняў эксперыментальных класаў. Пры раздзельным навучанні дзяўчынкі адчуваюць сябе больш свабодна, разняволена, упэўнены ў сабе, правільна ацэньваюць свае інтэлектуальныя здольнасці. Іх актыўнасць на ўроках, імкненне дасягнуць добрага выніку значна вышэйшыя, чым у класах сумеснага навучання, значыць і вышэйшая іх паспяховасць.

А якія ж перспектывы падрастаючага мужчынскага насельніцтва мікрараёна? Не ўсе ж маюць схільнасці да фізікі і матэматыкі. Трэба сказаць, што эстэтычную школу вітаюць многія бацькі, у якіх растуць хлопчыкі. З гэтым пытаннем я звярнулася да дырэктара.

— Наша мара, наша мэта — стварэнне жаночай гімназіі, — гаворыць Яўгенія Рыгораўна. — У нас ёсць упэўненасць у тым, што мы зможам выхаваць дзяўчынак на аснове іх прыродных схільнасцяў да музыкі, жывапісу, танцаў, даць ім магчымасць паглыблена вывучаць замежныя мовы, асновы нацыянальнай і музычнай культуры, дапамагчы набыць працоўныя навыкі. Мы хочам выхаваць будучых удумлівых, духоўна багатых мам, жонак, актыўных у грамадскім жыцці, гатовых да працы і самаадукацыі. Пакуль усе астатнія класы, за выключэннем эксперыментальнага, з'яўляюцца класамі сумеснага навучання. Есць у нас пакуль адзін, першы, клас хлопчыкаў. Але калі школе суджана стаць жаночай гімназіяй, то хацелася б — няхай прыслухаюцца да нашай думкі і Міністэрства адукацыі, і гарадское ўпраўленне — каб у суседнім, плануемым пад забудову, раёне "Усход-3" школа адразу была спраектавана і пабудавана як мужчынская гімназія. І пажадана, каб пабудавалі яе па асобным праекце — прыгожай, арыгінальнай, а не проста сумнай шэрай скрынчакай. І абавязкова з адмежаваным крылом або будынкам для пачатковых класаў. Гэта неабходна, таму што старшакласнікі часта крыўдзяць малых.

Да таго ж, у ходзе эксперыменту мы прыйшлі да высновы, што ў старэйшых 10—11-х класах юнакам і дзяўчатам можна зноў даць магчымасць навучацца ў сумесных класах, таму што да гэтага узросту яны ўжо фарміруюцца духоўна і могуць з павагай адносіцца адзін да аднаго.

Эксперымент яшчэ не закончаны. Школе неабходна расшыраць навуковую базу, плануецца увесці навучанне другой замежнай мове ў некалькіх старэйшых класах, а для гэтага патрэбна дадатковае фінансаванне.

Вельмі хочацца верыць, што высакародная праца педагогаў не застанецца па-за ўвагай. І неўзабаве ля ўваходу ў школу мы прачытаем надпіс "Жаночая гімназія". Першая ў Мінску.

Людміла РУПО.

ПРАВЕРЦЕ ПРАВІЛЬНАСЦЬ АФАРМЛЕННЯ АБАНЕМЕНТА

На абанементе павінен быць пастаўлены адбітак касавай машыны.

Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанементе прастаўляецца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету або часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай карткай запаўняецца падпісчыкам чарнілам, разборліва, без скарачэнняў, адпаведна ўмовам, выкладзеным у каталогах.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі "ПВ-МЕСЦА" робіцца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

Чытач піша ў "Настаўніцкую газету"

ПАДРУЧНІК ГІСТОРЫІ: ГРАМАДСКАЯ ЭКСПЕРТЫЗА

Чым бліжэй да ісціны, тым далей ад яе?

Тое, што з'явіліся новыя дапаможнікі па гісторыі Беларусі, вядома, павінна радаваць настаўнікаў гісторыі. Ды і не толькі нас непасрэдна, але і навучэнцаў, іх бацькоў. Нарэшце, як здавалася на першы погляд, мы дачакаліся таго, пра што так доўга марылі — атрымалі нацыянальныя кніжкі па гісторыі ўласнай краіны, якія па зместу павінны быць аб'ектыўнымі і зразумелымі, да таго ж — справядлівымі, без шкодных ідэй і розных наслаенняў.

Такога дапаможніка чакалі ўсе. Хто ж не хоча даведацца пра тое, як яно было на самай справе ў гісторыі беларускага народа? Хто яны такія, беларусы? Пры якіх умовах складваўся лёс нацыі? Чым народ цікавіўся? Чым займаўся? Якім было беларускае грамадства? Якія ўсталёўваліся адносіны з суседзямі? Якая роля беларускай дзяржавы ў павышэнні дабрабыту ўласнага насельніцтва? Як і чым дзяржава садзейнічала развіццю беларускай навукі, асветы, адукацыі, культуры? У чым выявілася заслуга беларускіх асветнікаў, грамадскіх, рэлігійных і дзяржаўных дзеячаў? Чым вызначаліся беларусы ў асобныя гістарычныя эпохі? Які ўклад унесла беларуская дзяржава ў агульную скарбонку сусветнай цывілізацыі? Па якім напрамку развівалася і развіваецца гісторыя беларускага народа?

Але тут на хвілінку можна прыпыніцца, бо, на мой погляд, пытанняў і праблем па любой гісторыі, а тым больш па гісторыі роднага краю, вельмі шмат. Прыпыніцца, каб, з улікам рэалій, прыгадаць дыялектычную формулу: чым бліжэй мы да ісціны, тым далей яна ад нас...

Сапраўды, калі пачынаеш перагортваць старонкі найновшай прадукцыі нашых навукоўцаў-гісторыкаў і знаёміцца з іх зместам, асобнымі вядучымі ідэямі і палажэннямі, становіцца крыўдна і сорамна за іх. Вучоныя нібы зганяліся: напісаць дапаможнікі так, каб у іх навучэнцы не разабраліся, нічога не зразумелі, што беларусы — аўсім і не беларусы, а так сабе — нейкая аморфная сумесь...

Дык што ўсё-такі цяжка даецца нашым школьнікам, калі яны спрабуюць засвоіць ісціны з першапачатковых дапаможнікаў?

Усяго, вядома, не пералічыш. Аднак паспрабуем паказаць выразныя хібы ў зместе новых кніг.

Вось перад намі "Гісторыя Беларусі. Старажытныя часы і сярэднявечча" (Навучальны дапаможнік для вучняў 5-га — 6-га кл. Аўтары Г.В.Штыхаў, У.К.Пляшэвіч. -Мн.: Нар. асвета, 1993. — 255 стар.).

Як жа зразумець падлеткам і пасцігнуць сэнс некаторых паняццяў, якія сустракаюцца, напрыклад, ужо ў тэме I: "УМОВЫ ЖЫЦЦЯ, ЗАНЯТКІ І СУПОЛЬНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ"?

Вось першыя складанасці пры вывучэнні пытання "Асваенне людзьмі беларускіх зямель у IX тысячагоддзі да н.э. — V ст.н.э.", (§ 5, с. 30 — 35). На старонцы 30 чытаем "Па меры адступлення ледавіка іншае асваенне НЕЗАСЕЛЕНЫХ РАНЕЙ ТЭРЫТОРЫЙ (тут і далей выдзелена мною - А.З.). ...Але ніводная з груп НОВЫХ НАСЕЛЬНІКАЎ, відаць, не была настолькі вялікай, каб засяліць значную тэрыторыю. Гэта прывяло да ўтварэння ПАЛСОБНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ ЛЮДЗЕЙ".

Да мяне звяртаюцца школьнікі з наступнымі пытаннямі:

1. Ці многа было НЕЗАСЕЛЕНЫХ РАНЕЙ ТЭРЫТОРЫЙ? Ці азначае гэта, што на гэтых тэрыторыях ніхто ніколі не пражываў? Значыць, гэта тэрыторыя была нічыйнай?

2. Хто былі НОВЫЯ НАСЕЛЬНІКІ? Проста старажытныя людзі? Ці НОВЫЯ НАСЕЛЬНІКІ былі славяне?

3. Як называліся ПАЛСОБНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ у гэты час?

Як бачым, пытанні ёсць, а адказаў у дапаможніку няма.

Нічога не высветлілася вучням і пры засваенні пытання "Стаянкі і ўмовы жыцця людзей у апошніх тысячагоддзях каменнага веку" (с. 31). Вось што тут напісана: "Невыпадкова трацце тысячагоддзе да н.э. увайшло ў гісторыю Еўропы як час першага "вялікага перасялення народаў". У сярэдзіне гэтага тысячагоддзя на паўднёвым і паўночным усходзе Беларусі паселіліся ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫЯ І ЗЕМЛЯРОБЧЫЯ ПЛЯМЁНЫ. Пакуль што цяжка гаварыць аб узаемаадносінах МЯСЦОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА І ПРЫШЭЛЬЦАЎ. Напэўна, былі і сутычкі, але з цягам часу НОВЫЯ ЛЮДЗІ ЗМЯШАЛІСЯ З МЯСЦОВЫМІ".

Адразу ж узнікае шэраг пытанняў:

1. Хто такія былі ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫЯ І ЗЕМЛЯРОБЧЫЯ ПЛЯМЁНЫ? Гэта былі ўсходнія славяне? Альбо іншыя народнасці?

2. Аказваецца, тут, на беларускіх землях, пражывала МЯСЦОВАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА. Дык хто яны былі такія? Славяне ці хто другі?

3. Нарэшце зноў не зразумела, хто такія НОВЫЯ ЛЮДЗІ? Славяне ці хто іншы?

4. Урэшце рэшт вучні становяцца ў тупік, калі чытаюць выраз "з цягам часу НОВЫЯ ЛЮДЗІ ЗМЯШАЛІСЯ З МЯСЦОВЫМІ".

Вучні са зместу дапаможніка (с. 30) ужо ведаюць, што іншае асваенне НЕЗАСЕЛЕНЫХ РАНЕЙ ТЭРЫТОРЫЙ. Дык чаго тады НОВЫЯ ЛЮДЗІ ЗМЯШАЛІСЯ З МЯСЦОВЫМІ? Не хапала зямлі? Не было вопыту як пражыць між прышэльцамі?

А тут яшчэ ў мяне ёсць вельмі дапытлівы хлопчык. Ён пытаецца: "На якой мове размаўлялі НОВЫЯ ЛЮДЗІ і мясцовае насельніцтва? Як яны дамаўляліся паміж сабой? Шкоў жа тады не было, каб вывучаць замежную мову?"

ХТО быў карэннымі жыхарамі Беларусі — НОВЫЯ ЛЮДЗІ ці МЯСЦОВАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА?

Адказу на гэтыя пытанні ў зместе новых дапаможнікаў па гісторыі Беларусі няма.

Можа ўсё стане на месца пры вывучэнні пытання "Насельніцтва Беларусі ў бронзавым і раннім жалезным веку (с. 33 — 35)"? Чытаем: "спачатку ПРЫШЭЛЬЦЫ паселіліся ў Палессі і на Падняпроўі... Паступова жывёлагадоўчыя плямёны заселілі ўсе беларускія землі і Прыбалтыку. Відома, напачатку іх адносінам з МЯСЦОВЫМ НАСЕЛЬНІЦТВАМ не маглі быць мірнымі. ...Жывёлагадоўчыя плямёны свой посуд упрыгожвалі адбіткамі шнура. Таму іх вучоныя назвалі "шнуравымі". Праз некаторы час МЯСЦОВАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА пачало прымаць звычаі і гаспадарку гэтых плямён". Зноўку пытанне: "Хто былі будучыя беларусы: "шнуравыя" ці МЯСЦОВАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА?" І ці мала розных іншых высноў падае на галовы пяцікласнікаў? Няўжо ўсё гэта патрэбна дзецям-пяцікласнікам? Тым больш, што тэрыторыю Беларусі ў той час (с. 33) паселялі некалькі племянных груп. Адна з іх жыла ў Беларускім Падняпроўі і вярхоўях Прыпяці. Сёння гэтыя плямёны называюць мілаградскімі (ад вёскі Мілаграды Рачыцкага раёна). Існавалі яшчэ другая і трэцяя групы плямён (с. 34), якія чамусьці не атрымалі найменні. Ці патрэбна гэта навучэнцам? Тым больш, што пытанне аб іх прыналежнасці да адпаведнай супольнасці людзей пакуль яшчэ не вырашана. Праўда, ёсць, нарэшце, радасная вестка. Так, некаторыя навукоўцы лічаць, што мілаградцы і зарубінцы належалі да ранніх славян (с. 34). Вось адкуль, відаць, пачыналася беларуская народнасць! Значыць, менавіта з гэтага месца і часу патрэбна вывучаць гісторыю беларусаў. "...Адным шэрагам істотных рыс звязваюць мілаградцаў і зарубінцаў з БАЛТАМІ, ПРОДКАМІ СУЧАСНЫХ ЛІТОЎЦАЎ І ЛАТЫШОЎ" (с. 35). У такім разе навошта ж нам вывучаць гісторыю іншых народаў, калі нам патрэбна гісторыя свайго?

Праўда, цяперашні дапаможнік супакойвае чытача. Маўляў, неабходна ўлічыць, што "СЛАВЯНЕ, БАЛТЫ, ГЕРМАНЦЫ, РАМАНЦЫ, ГРЭКІ і іншыя народы ведуць сваё паходжанне ад агульнага продка. Гэта былі індаеўрапейцы (с. 35). ...Яны пранікілі на тэрыторыю Беларусі, Прыбалтыкі і Цэнтральнай Еўропы. Пазней індаеўрапейцы ЗМЯШАЛІСЯ з МЯСЦОВЫМ НАСЕЛЬНІЦТВАМ. Аднак адна такая група плямён аформілася ў балтаў, а другая — у славян. У выніку мы можам лічыць нашымі продкамі ўсе плямёны, якія жылі тады на тэрыторыі Беларусі (с. 35)". Бачыце, як проста ўсё вырашэцца!.. Толькі на адной 35 старонцы дапаможніка столькі супярэчнасцяў... У першым абзацы сказана, што БАЛТЫ — продкі СУЧАСНЫХ ЛІТОЎЦАЎ І ЛАТЫШОЎ... У трэцім абзацы паведамляецца, што ўсе плямёны мы можам лічыць нашымі продкамі! Як гэта ўсвядоміць пяцікласнікаў?!

На мой погляд, няма сістэмы, па якой лягчэй можна засвойваць гістарычны матэрыял. Усё-такі многа тут пабочнага, непатрэбнага. І не трэба ўводзіць лішняе ў дапаможнік. Гэта ж робіцца не для студэнтаў гістарычнага факультэта універсітэта. Тут трэба ўзяць толькі асноўнае і неабходнае. На маю думку, за аснову можна ўзяць наступныя пытанні:

1. Найстаражытнейшы чалавек на тэрыторыі Беларусі.

2. Першыя стаянкі людзей на беларускіх землях.

3. Заняткі старажытных жыхароў Беларусі.

4. Праабшчына і прычыны яе распаду.

5. Узнікненне ранняй родавай абшчыны. Мацярынскі род.

6. Пачатак аб'яднання родаў у плямёны. Утварэнне новых плямён.

7. Зараджэнне і развіццё жывёлагадоўлі і земляробства.

8. Позняя родавая абшчына і яе развіццё. Фарміраванне бацькоўскага роду.

9. Уяўленні старажытнага чалавека аб навакольным асяроддзі.

10. Вытворчыя звычаі і абрады.

11. Мастацтва.

12. Вынікі развіцця першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі да VI стагоддзя.

Вядома, што могуць быць і іншыя, больш навуковыя, варыянты зместу дапаможніка. Але гэта трэба зрабіць так, каб было зразумелым для пяцікласнікаў, карысным для іх, садзейнічала развіццю разумовых здольнасцяў і фарміраванню светапогляду.

Андрэй ЗАЙЦАЎ,
настаўнік гісторыі
Балатынскай школы
Рагачоўскага раёна.

ЯКІМ МНЕ БАЧЫЦЦА ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ

НАЙПЕРШ — ЛІДЭР НАЦЫІ

АД РЭДАКЦЫІ

23 чэрвеня адбудуцца выбары першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Мы яшчэ не ведаем праграм шасці кандыдатаў у прэзідэнты, але відавочна, што ад вынікаў усенароднага галасавання залежыць вельмі многае: пераадоленне глыбокага эканамічнага і сацыяльнага крызісу, масавай духоўнай карозіі, рашучае ўтаймаванне злачыннасці, спыненне збяднення большасці насельніцтва, нацыянальна-культурнае Адраджэнне, міжнародны аўтарытэт маладой беларускай краіны, — словам, лёс нашага далейшага дзяржаўнага будаўніцтва.

"Настаўніцкая газета" адкрывае новую рубрыку: "Якім мне бачыцца Прэзідэнт Беларусі". Спадзяёмся на актыўнасць і зацікаўленасць нашых чытачоў.

Сёння свой пункт гледжання выказвае доктар гістарычных навук Леанід Міхайлавіч Лыч.

Доўгае панаванне ў СССР суперцэнтралізаванай камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання народнай гаспадаркай не садзейнічала фармаванню буйных дзяржаўных дзеячаў ні ў цэнтры, ні на перыферыі: у саюзных і аўтаномных рэспубліках. За ўвесь перыяд існавання гэтай заганнай сістэмы ў СССР па сутнасці не з'явілася ніводнай таленавітай, сусветнага статуса асобы ні ў дзяржаўных, ні ў партыйных органах. Не сакрэт, што, паводле ўсіх асноўных параметраў палітыка, генсек ЦК КПСС Канстанцін Чарненка значна ўступаў свайму пераемніку Міхаілу Гарбачову, але перапы куды лепш адчуваў сябе ў асяроддзі савецкай партыйна-дзяржаўнай таталітарнай сістэмы і нават сёе-тое рабіў для ўмацавання, але ўсё ж найбольш стараўся захаваць статус-кво. Другі, як больш здольны і разумны палітык, паспрабаваў яе ўдасканаліць, трохі аслабіць сілавыя метады кіравання, ад чаго яна ўраз абрынулася, прыдушыла і самога гаспадара. Выходзіць, што паспрэдны палітык Чарненка больш адпавядаў той сістэме, чым не пазбаўлены таленту дзяржаўнага і партыйнага дзеяча Гарбачоў.

Гэтая сістэма яшчэ больш не садзейнічала росту прафесіяналізму кіраўнікоў рэспубліканскага маштабу. Такія якасці ёй проста былі не патрэбнымі. Вышэй за ўсіх каціраваўся той палітык саюзнай рэспублікі, хто бездакорна, безагаворачна выконваў волю Цэнтра, не задумваючыся, падпарадкоўваў рэспубліканскі інтарэс агульнасаюзнаму ці, як тады любілі гаварыць, нацыянальны інтарэс Інтэрнацыянальнаму. Зразумела, у тых умовах ніводзін з рэспубліканскіх ці партыйных дзеячаў не мог вырасці ў сапраўднага лідэра нацыі. Такія дзеячы проста лішнімі былі, бо яны, напэўна ж, тармазілі б ажыццяўленне памылковай, шкодных палітыкі зближэння і зліцця культур і моваў, а разам з гэтым і іх носьбітаў у адну супольнасць людзей уяўнага камуністычнага грамадства. Са значным апярэджаннем, у параўнанні з іншымі рэспублікамі, ішла да гэтай каварнай мэты Беларусь, кіраўнікі якой найбольш верна служылі Крамлю — генератару і Цэнтру — савецкай таталітарнай сістэмы, палітыкі зліцця нацый.

Самым негатыўным чынам уздзейнічала даная сістэма на апаратчыкаў абласных і раённых органаў улады, розных грамадска-палітычных арганізацый, кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў і ўстаноў. Таму і сярод іх нихто не вырас у самастойнага, сапраўднага гаспадара, які без падказкі зверху, незалежна ад чужой волі мог бы разумна весці справу. Талент такога кіраўніка вызначалі найперш бездакорнасцю, паслухмянасцю пры выкананні дасланых яму зверху інструкцый. Таму не трэба здзіўляцца, што амаль усе выхаваныя савецкай таталітарнай сістэмай кіраўнікі так баяцца брацца за самастойнае вырашэнне пытанняў вытворча-эканамічнай дзейнасці і не хочуць бачыць яе інакшай, як толькі моцна інтэграванай у народную гаспадарку Расіі, гатовыя ісці на любы варыянт, аўсім не зважаючы, як гэта ўзгаднясецца з захаваннем нацыянальнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Не можа не хваляваць, што на такі прымітывізм у падыходах да кіравання эканомікай краіны хварэюць і самыя высокія дзяржаўныя палітыкі, буйныя арганізатары вытворчасці. Часта думаю: ну а што б такія асобы рабілі, калі б Расія раптам адмовілася ўзяць нас пад сваю апеку? Поўны правал! Канец існаванню Беларусі, бо ў іх жа няма аніякага альтэрнатыўнага варыянта. Толькі гаспадарчая інтэграцыя з Расіяй, толькі аб'яднанне банкаўскай сістэмы... Іншага выйсця нібыта не існуе ў прыродзе дзеяння эканамічных законаў на Беларусі.

Аднойчы, едучы ў аўтобусе ў сваю родную вёску Магільнае Уздзенскага раёна, выпадкова апынуўся на сядзенні побач з кіраўніком раённага маштабу, прычым не першага — трэцяга рангу. Завязалася размова. Задаю пытанне: "Колькі часу праіснаваў бы Уздзенскі раён, атрымаўшы статус нацыянальнай незалежнасці?" Тут жа пачуў адказ: "Вечна, калі толькі не нападзе на нас буйная суседняя дзяржава". Мой суразмоўца пачаў даводзіць, што ў выпадку набыцця нацыянальнага суверэнітэту ён рабіў бы ўсё магчымае па максімальным выкарыстанні ўнутраных рэсурсаў, наладжванні эканамічных і іншых сувязяў раёна з суседнімі і далёкімі краінамі. І ўсё гэта так добра аргументаваў, што пярэчыць яму, сумняваюцца стаў бы, можа, самы заядлы праціўнік нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту. Я сам сабе толькі падумаў: ну ёсць ж людзі, якія верацъ у стваральны патэнцыял уласнага народа, яго здольнасць выжыць у любой экстрэмальнай сітуацыі, не баяцца суверэнітэту, калі б размова датычала нават самай невялічкай тэрыторыі, не тое што Беларусь.

Абрыдзела чытаць і слухаць з вуснаў кіраўнікоў усіх рангаў, што толькі з распадам СССР і абрывам у выніку гэтага эканамічных сувязяў Беларусь пакацілася ў бездань. Бо ёсць тут і іншыя, не менш важкія прычыны. Калі ж справа датычала толькі эканамічных сувязяў, дык чаму ж, шаноўныя апаратчыкі, вы так марудзілі і амаль нічога не рабілі для іх неадкладнага аднаўлення? Гэтаму, дарэчы, зусім не перашкаджаў развал Саюза. Эканамічныя сувязі рваліся і не адналяліся толькі таму, што гэта было выгадна ўладу маючым. Вы толькі падумайце, колькі за час, як лопнулі гэтыя сувязі, пабудавана (толькі не на ўласныя сродкі!) шыкоўных катэджаў, прыдбана (і зноў жа не за свае грошыкі!) легкавых — найчасцей імпартных, найноўшых марак — аўтамашын?! А колькі імі зроблена дарагіх, але бескарысных для краіны і народа паездак за мяжу?! Пры існаванні СССР і характэрных для яго эканамічных сувязяў такім асобам і сотай долі не ўдалося б пацягнуць з дзяржаўнай кішэні.

Цяпер жа, добра нажыўшыся за кошт дзяржавы і народа, можна паплакаць і па Саюзе, і па эканамічных сувязях, настойліва шукаць шляхі інтэграцыі з Расіяй, каб з яе дапамогай як-небудзь выцягнуць з прорвы Беларусь, бо інакш давядзецца раскашэліцца, штосьці вярнуць з нарабаванага. А вярнуць яго ўсё ж давядзецца, нават далучыўшыся да Расіі. Тады і ўсё багацце, што перапала ў рукі ўсякага роду прайдзісветаў, вернецца ў дзяржаўную казну, у ёй тады не на пяць, а на цэлых дзесяць гадоў хопіць грашовых сродкаў для пакупкі нафты, каменнага вугалю, металу, медыкаментаў і г.д. за мяжой. За гранічна сціслы тэрмін можна будзе наладзіць эканамічныя сувязі, толькі не такія нерацыянальныя, як пры СССР.

На такім нізкім узроўні эфектыўнасці, як у Саюзе, мала дзе была арганізавана вытворчасць, што якраз і тлумачыць яго хуткі развал і немагчымасць аднаўлення колішняй велізарнай дзяржавы, нягледзячы на ўсе спробы, што робяцца ў Расіі, Беларусі і іншых былых саюзных рэспубліках. Таму тыя з кандыдатаў у прэзідэнты Беларусі, якія чапляюцца за аднаўленне старых, малаэфектыўных эканамічных сувязяў, глядзяць толькі на ўсход, не выведуць наш народ на шлях самастойнага, незалежнага развіцця, на якім толькі і можна было б дасягнуць сапраўднага прагрэсу.

Калі да высокай пасады Прэзідэнта прыйдзе асоба камуністычнай перакананасці, то будзе імкнуцца праводзіць палітыку па стварэнні буйной, паводле маштабаў, федэратыўнай дзяржавы як неабходнай перадумовы для шырокага распаўсюджвання "непераможных" сацыялістычных, камуністычных ідэй на планеце Зямля, марыць і працаваць на карысць сусветнай рэвалюцыі, праводзіць у жыццё міф аб збліжэнні і зліцці культур і моваў з мэтай утварэння нейкай агульнай камуністычнай супольнасці людзей, вучыць народы падпарадкоўваць сваё нацыянальнае інтэрнацыянальнаму.

Гісторыя, пры маўклівай згодзе народных масаў, адвяла бальшавікам за 70 гадоў (!) для правядзення эксперыменту па пабудове "шчаслівага сацыялістычнага грамадства". Не атрымалася. І, зразумела, па іх жа віне, бо яны за гэты вялікі тэрмін не змаглі распрацаваць сур'ёзную навуковую тэорыю сацыялізму, а, галоўнае, былі пасрэднымі, калі не сказаць — кепскімі перапраўвальнікамі яе ў жыцці, больш дбалі пра ўласны, чым агульнанародны інтарэс. Цяпер іх цягнік адышоў...

Іншы раз можна пачуць, што прэтэндэнту на прэзідэнцкае крэсла абавязкова трэба мець багаты вопыт дзяржаўнага палітыка, кіраўніка вытворчасці. Не магу пагадзіцца з гэтай думкай. Сусветная практыка ведае шмат прыкладаў, калі ў такое крэсла садзіўся хтосьці з прадстаўнікоў навуковай, творчай інтэлігенцыі, але дзякуючы высокай эрудыцыі і культуры, чалавечнасці і прыстойнасці, бязмежнай адданасці свайму народу поўнасцю апраўдваў яго давер. Вось найбольш пераканаўчы прыклад: былы кінаакцёр, а затым прэзідэнт ЗША Рональд Рэйган так павёў справу, што краіна значна ўзбагаціла свой эканамічны патэнцыял, набыла яшчэ большую прэстыжнасць у свеце.

Далей. Чэшскі драматург, ён жа прэзідэнт Чэхаславакіі Вацлаў Гавел так арганізаваў скасаванне чэшска-славацкага "шлюбу", што не парваў аніводнай эканамічнай ніткі паміж гэтымі двума народамі, не выклікаў нават сімвалічнага канфлікту сярод іх на нацыянальнай глебе. Што ж датычыць эканомікі, дык яе развіццё залежыць не столькі ад прафесійных ведаў прэзідэнта, колькі ад кампетэнтнасці работнікаў апарату выканаўчай улады, кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, саміх прадпрыемстваў. Прэзідэнт, на мой погляд, павінен быць не так гаспадарнікам, як увасабленнем найлепшых рысаў, сапраўдным светачам, сумленнем сваёй нацыі, шляхетна выхаваным на яе традыцыях і культуры, цудоўна валодаць і ўсюды карыстацца яе роднай мовай, нідзе і ні ў чым не здрадзіць дзяржаўнаму суверэнітэту, без якога любому народу наканавана неминучая пагібель.

Нашы першыя дзяржаўныя асобы ўжо неаднойчы трымалі экзамен, давалі народу абяцанні вывесці Беларусь з эканамічнага крызісу. Сёння ж трэба кожнаму прэтэндэнту на пасаду Прэзідэнта краіны яшчэ выказаць свой пункт гледжання і на шляхі выратавання беларускага народа ад духоўнага заняпаду, выступіць з канкрэтнай праграмай рашучага і неадкладнага адолення рускай культурна-моўнай асіміляцыі, якая ўжо даўно набыла на нашай зямлі небяспечны характар, паставіла пад вялікае сумненне далейшае існаванне аднаго з самых развітых у мінулым славянскага народа, ад чаго толькі збядняецца культурны патэнцыял усёй славянскай супольнасці людзей. Во дзе непачаты край для дзейнасці Народнага руху Беларусі, Славянскага сабора "Белая Русь", да чаго іх абавязваюць самі назвы! Магчыма, мне вядомы не ўсе іх праграмныя дакументы, але тое, што чытаў у іх, лічу, не выратуе беларускую нацыю ад рускай культурна-моўнай асіміляцыі. Найбольшую ж пагрозу нашаму народу нясуць спробы гэтых аб'яднанняў увесці дзяржаўнае двухмоўе.

Вялікая трагедыя, што ў той ці іншай ступені гэтую пазіцыю падзяляюць і прэтэндэнты ў Прэзідэнты. Калі б дзяржаўнае двухмоўе і сапраўды было панацэяй для магутнага духоўнага росквіту, стабілізацыі нацыянальнай самасвядомасці, яго даўно ўзялі б у сябе ЗША, Расія, Кітай, Францыя, Германія, Японія, Іспанія...Не веру, што погляды многіх нашых палітыкаў і вучоных на даную праблему больш прагрэсіўныя, больш навукова абгрунтаваныя, чым у іх калег з пералічаных краін. Спасылка, што ў наш час традыцыйна моцныя пазіцыі рускай культуры і мовы, а таму, маўляў, патрэбна захаваць за імі статус-кво — зусім неабгрунтаваная, бо ўсё гэта склалася галоўным чынам дзякуючы дасканала прадуманай, умела праведзенай імперскай палітыцы русіфікацыі нашага краю. Цяпер жа Беларусь стала суверэннай дзяржавай і таму павінна паслядоўна і рашуча вызваліцца ад шкодных, небяспечных вынікаў былой і сучаснай русіфікацыі.

Мінула амаль пяць гадоў ад часу прыняцця Закона аб мовах, гэта значыць столькі, колькі нават і студэнтам-завочнікам адводзіцца на вывучэнне англійскай, нямецкай, французскай і іншых замежных моваў. І калі хтосьці, хто займае прэстыжныя пасады, і не вучыў беларускую мову, дык гэта найперш проста бездаказная асоба, праціўнік беларускага Адраджэння. Не, зусім не такія былі ў нас дзяржаўныя кіраўнікі, гаспадарнікі ў перыяд беларусізацыі 20-х гадоў. У 1925 годзе, г.зн. на другі год, як беларусізацыю паставілі на дзяржаўны грунт, у цэнтральных (рэспубліканскіх) установах толькі 22 працэнты з агульнай колькасці супрацоўнікаў валодалі беларускай мовай, у акруговых і раённых — 36, затое ў 1927 годзе адпаведна 80 і 70 працэнтаў. Як бачым, страх страціць з-за яведання беларускай мовы добра аплатнае месца вымушаў асобаў больш высокага статуса вывучаць яе значна хутчэй, чым гэта рабілі апаратчыкі ніжэйшага рангу. Каб і сёння дзяржава так паважліва глядзела на беларускую мову, яе па-сур'ёзнаму, у тэмпе вывучалі б усе, хто імкнецца да заняцця прэстыжных пасадаў у грамадстве, у тым ліку стаць і кандыдатам у Прэзідэнты краіны.

Не баюся абвінавачанняў у нацыяналізме (нават махровым!) і адназначна скажу, што сёння Прэзідэнтам павінен быць толькі беларус, прычым не пашпартны, а толькі па нацыянальнай самасвядомасці і пераканананасці, які добра пачувае сябе ў беларускай культурна-моўнай стыхіі. Не хачу сапсаваць і без таго кепскі настрой сваіх нацыянальна-самасвядомых супляменнікаў з-за марудных тэмпаў, павольнага Адраджэння, але ўсё ж заўважу, што наш гарапашны народ пакуль што яшчэ знаходзіцца ў стане этнічнай клінічнай смерці. Паставіць яго на ногі змогуць не палітычныя дзеячы з катэгорыі Рурыкавічаў, а самі беларусы, бо ніхто так, як яны, не зацікаўлены ў выратаванні сябе, у захаванні той нішы, якую адвяла ім гісторыя ў цывілізаваным свеце. Таму ў нашай архіскладанай сітуацыі так важна, каб не толькі сам Прэзідэнт краіны быў апантаны нацыянальным Адраджэннем, але каб у руках такіх жа беларусаў знаходзіліся і ўсе іншыя камандныя пасады, працуючы на якіх, можна самым рашучым, эфектыўным чынам уплываць на выхад нашага народа з эканамічнага і духоўнага заняпаду, нарэшце спыніць разбуральнае ўздзеянне на нас культурна-моўнай асіміляцыі, якая нікольні не паменела з атрыманнем Беларуссю статуса суверэннай дзяржавы.

Што датычыць выкарыстання на такіх прэстыжных пасадах прадстаўніка некарэннага насельніцтва, дык, думаецца, мэтазгодна толькі ў выпадку, калі ён прыхільна ставіцца і гатоў служыць ідэі Адраджэння нашага краю, паважае яго духоўныя традыцыі, валодае беларускай мовай. Добра, што з кожным годам такіх людзей становіцца ўсё больш у асяроддзі нацменшасцяў Беларусі. Асабліва вялікія надзеі ўскладаюцца на рускую, украінскую і польскую нацменшасці, якія не зведаюць і грама шчасця ад культурна-моўнай дэградацыі свайго сабрата па славянскай этнічнай супольнасці. Прыярытэт карэннаму насельніцтву надавалі ўсе народы на крутых паваротах сваёй гісторыі. Не думаю, што сярод прадстаўнікоў белай расы ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы не знайшлося ніводнага чалавека, які на пасадзе Прэзідэнта гэтай краіны мог бы абараніць інтарэсы яе карэннага насельніцтва. Але ва ўмовах магутнага нацыянальнага руху перамагае негр Нэльсан Мандэла, бо толькі ў ім найбольш увасоблены нацыянальны дух абарыгенаў гэтай дзяржавы.

Нашы нашчадкі наўрад ці даруюць творчай інтэлігенцыі (асабліва пісьменнікам), як найбольш уплываваў і аўтарытэтнай у кожнага народа, што ў такі адказны для беларускай нацыі час яна не вылучыла са свайго асяроддзя аніводнага прэтэндэнта на прэзідэнцкае месца. Зусім верагоднага паражэння тут нельга было баяцца, бо народ жа добра разумее, якімі магчымасцямі ў набыцці галасоў валодаюць творчая, навуковая інтэлігенцыя і тыя, хто працуе ў розных дзяржаўных і адміністратыўна-гаспадарчых структурах. Для інтэлігенцыі тут проста важным было заявіць народу, што яна гатовая служыць, дапамагчы яму ў гэтую адказную часіну. Як ніколі пасўшы паводзіны інтэлігенцыі нельга апраўдаць яе сціпласцю, памяркоўнасцю. Народ, хутчэй за ўсё, ахарактарызуе гэта як праяву абыякавасці, раўнадушша інтэлігенцыі да яго лёсу. Што ж, была ідэалагічная служба Кампартыі Беларусі можа ганарыцца, што ёй удалося выхаваць такую нацыянальна-аморфную інтэлігенцыю нават і сярод яе самых прэстыжных і паважаных катэгорый. Калі ж яшчэ гэтыя катэгорыі не вылучаць са свайго асяроддзя кандыдатаў у народныя дэпутаты, і асабліва рэспубліканскага рангу, можна лічыць, што беларускі народ у самы адказны момант сваёй гісторыі застанецца без сапраўднай, надзейнай падтрымкі, і ідэя яго нацыянальна-культурнага Адраджэння будзе доўгія гады мець чыста сімвалічны характар.

Звычайным ініцыятыўным спосабам гэтую праблему не вырашыць. Яна пад сілу толькі спаўна надзеленым дзяржаўнай уладай, нацыянальна-самасвядомым, актыўным беларусам.

Леанід ЛЫЧ,
доктар гістарычных навук.

МЕРКАВАННЕ

Наперадзе цягніка

Дзіцячыя часопісы "Бярозка" і "Вясёлка" былі крыніцай цікавага матэрыялу ў арганізацыі пазакласнай работы нашых навучэнцаў у час школьнай практыкі. І ўсе тады, між іншым, мы прапаноўвалі і прапаноўваем тэмы курсавых прац, дзе патрабуецца творчае асэнсаванне публікуемага матэрыялу і магчымасцяў яго выкарыстання ў навучальна-выхаваўчым працэсе пачатковай школы.

Цяпер працуем толькі з "Вясёлкай".

А што ж "Бярозка"? Вось парада мной тэзіс кумар гэтага часопіса за бягучы год. Не бяруся аналізаваць яго змест. Але хачу адзначыць, што тут ёсць матэрыялы, якія з задавальненнем выкарыстаў бы і настаўнік пачатковай школы, напрыклад: і нізка вершаў "Па ельнічку, па бярэзнічку" Васіля Зуёнка, і цікавае паведамленне з рубрыкі "Каляндар" пра Тараса Шаўчэнку, і выдатны верш Кабзаря ў перакладзе на беларускую мову, і "Куфэрак для цікаўных". А хіба застаўся б па-за ўвагай дзесяцісадовы юбілейчык артыкул М.Клімовіча "Што такое лімузін?".

Аднак змест — адно, а правапіс, які выпрацавала сабе рэдакцыя — гэта другое.

Як вядома, на Беларусі існуе адзіны моўны і арфаграфічны рэжым. І ён зацверджаны не толькі для школы.

Хачу зазначыць, што ў нас і так многа праблемаў з выпрацоўкай належнага ўяўлення пісьменнасці, культуры вуснай мовы. Акрамя таго, пры абмежаным нестабільнасці эканамічнага і палітычнага жыцця трэба вымагаць не толькі добрага педагога, але і свядомага грамадзяніна, які б меў уласную думку, і паважаў сваю спадчыну, законы сваёй дзяржавы, у тым ліку і Закон, які зацвярджае правапіс.

Праглядаючы мае разважанні, магчыма, некта з чытачоў усміхнецца: абрыдла "наркомаўка", а дырэктар каледжа адстае ад жыцця. Але хіба можна стаўсункі палітычным пераносіць на мову? Такі этап Беларусь ужо пераажыла. Мы сёння можам усміхнуцца, гартаючы марматыўныя слоўнікі і заўважаючы, што, напрыклад, назвы чатырох фармацый: маркізма, ленінізма, сацыялізма, камунізма — у родным склоне, як выключэнне, павінны лісаць з канчаткоўм — а, но так, як вярожны іх — фэадалізму, капіталізму. Мне здаецца, што і рэдакцыя "Бярозкі", акрылёная надзеяй апошніх гадоў, бяжыць наперадзе цягніка, размахваючы "новым" ці "ранейшым", да 1933 года правапісам.

Але ж існуе Дзяржаўная камісія па ўдасканаленні правапісу. Трэба было б нам усім пачакаць, можа нават з чыста этычных нормаў.

Што тычыцца мяне, то навучальная ўстанова, якой мне даверана кіраваць, адна з першых у Мінску цалкам перайшла на беларускую мову выкладання, хоць існавала і існуе шмат праблем. Сярод іх — адсутнасць падручнікаў па беларускай мове, мізкая моўная падрыхтоўка выпускнікоў, якія да нас трапляюць вучыцца. Прыходзяць былыя школьнікі з пацёркамі ў пасведчаннях і атэстатах, а ў нас да сапраўднай пацёркі іх часам і нельга давесці.

Асабіста я — за ўдасканаленне правапісу, за асіміляцыйную мяккасць спісцячых перад мяккімі зычнымі, хоць варта было б з гэтым абазначэннем і пачакаць, як растлумачыць такія, напрыклад, напісаныя ў "Бярозцы":

1. на фроньце (с.25, II слупок, 13 радок зверху); фінансісят (с.14, II слупок, 6 радок зверху);

2. адзьдзяленне (с.25, I слупок, 13 радок знізу); адзьдзяленьня (с.7, I слупок, 12 радок зверху);

3. надумаесься (с.26, I слупок, 22 радок зверху); сустрэнесься (с.22, II слупок, 6 радок зверху);

Калі кожнае перыядычнае выданне будзе мець свае правілы, дык што тады рабіць

ДЗЁННІК КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

ДЛЯ РОЗДУМУ

Уступныя рэфлексіі

Калі мы прызнаем, што культура — гэта агульны вопыт чалавецтва, тэорыя і практыка, матэрыя і дух, калі прызнаем, што нацыянальная культура — гэта адметнасць у агульнасці, то не зможам не прызнаць велізарную і амаль вызначальную ролю асветы, адукацыі і выхавання як галоўнага механізма перадачы ў спадчыну ўсіх здабыткаў культуры. Сістэма ведаў і традыцый, якая складваецца ў пэўны час і на пэўнай тэрыторыі — і ёсць культура рэгіёна. А калі рэгіён яшчэ і сам па сабе з'яўляецца культурным памежжам, то ён здольны сінтэзаваць і паказаць свету новы ўзровень разумення праблемаў культуры ў розных яе аспектах і праявах.

Культурнае развіццё рэгіёна як частка сусветнай сістэмы можа быць спланавана толькі з улікам асаблівасцяў сваёй зямлі і гісторыі, у часе і прасторы — хранатопа.

Пры тым мы можам быць цікавыя свету сваёй тутэйшасцю, але не ў стэрэатыпным разуменні недахопу самаідэнтыфікацыі, а топахронна — калі нацыя, прывязная да роднай зямлі, пачынае бачыць сябе ў гісторыі і ў часе.

Наш час патрабуе змяніць драпежніцкі характар тэхнакратычнай цывілізацыі, які ў сваёй моцы праявіўся ў фізічным і духоўным Чарнобылі на Беларусі і абавязвае нас мысліць глабальна і дзейнічаць лакальна.

Беларускасць як лад жыцця, беларускае светабачанне, ці бачанне свету па-беларуску, па сутнасці і ёсць мэтай беларускай асветы, адукацыі і культуры.

Культуравадпаведнае і міжкультурнае выхаванне дазваляе пазбегнуць як місіянерскіх імкненняў, так і звычак да падпарадкавання, што крайне неабходна ва ўмовах культурнага памежжа і агульнага культурнага лёсу.

Прыродавадпаведнасць беларускай адукацыйнай парадыгмы, па сутнасці, — натуральная з'ява, таму што прырода ў беларусаў — сістэмаўтваральны фактар. Законы хімічныя, фізічныя, матэматычныя, біялагічныя і ёсць законы прыроды. У гуманітарнай сферы прырода — гэта космас, агульнае пачуццёвае бачанне. Таму лучнасць дакладных, прыродазнаўчых і гуманітарных дысцыплін, іх узаемазалежнасць, узаемапранікненне і ўзаемімкненне — і ёсць шлях да сапраўднага бачання карціны свету.

Сканструяваць такую сістэму ведаў, заснаваных на роднай мове і светаглядзе, значна лягчэй на тэрыторыі, якая сама па сабе і ёсць мадэль-перакрыжаванне этнічных, моўных, рэлігійных і іншых працэсаў.

Канвергентнасць мясцовай рэгіянальнай культуры дае магчымасць прадуктыўных сінтэзаў. Многамерны, многаморны і рухомы шматколны свет — выдатнае асяроддзе для з'яўлення асветна-адукацыйна-выхаваўчага асяродку новага тыпу, а потым і сістэмы такіх устаноў.

Ланцуг жывой дзейнасці ўключае набор розных падыходаў і сродкаў. Гэта і ўсведамленне мовы як сістэмы ўсведамлення светабудовы, таму чым больш моваў, тым больш вокнаў у свет. Гэта і краязнаўства, якое з'яўляецца фокусам, праекцыяй сусветнай гісторыі і культуры на рэгіён, і ад яго — краязнаўчае. Гэта і культуралогія — падмурак, з якога добра разглядаць усе культурныя з'явы і праявы разам з іх творцамі ў рэчышчы дыялогу культур.

Безумоўна, забяспечыць жыццяздольнасць такой складанай сістэмы пры непарушнасці культурнай канстанты немагчыма без сапраўднага ключа. Такім ключом становіцца агульная тэорыя сістэм, якая ў артыкуле Мікалая Крукоўскага "Філасофія культуры" была названа каралевай навук за яе дакладнасць і ўніверсальнасць.

Навуковымі вынікамі тэорыі сістэм паспяхова карыстаюцца многія сучасныя прадпрыемствы, бізнес-структуры, тэхнічныя і гуманітарныя ВНУ, дзяржаўныя ўстановы Беларусі. Але ж самыя галоўныя вынікі прыйдуць тады, калі карыстальнікамі, даследчыкамі і вынаходцамі ў самых розных сферах жыцця з дапамогай тэорыі сістэм на парозе XXI ст. стануць самыя здольныя творцы — дзеці. Маладое пакаленне Беларусі. Толькі тады, калі ўзровень асветы і выхавання будзе адпавядаць узроўню складанасці сучасных праблемаў, стануць магчымы і змены ў жыцці.

Уласнае тварэнне культурных тэкстаў у рэгіянальным і сучасным кантэксце зробіць культуру жывой, а жыццё — культурным.

Святлана ЕСЬКА.
Гродзенская філія
Беларускага гуманітарнага
адукацыйна-культурнага
цэнтра.

ГЛЫТОК З ЧЫСТАЙ, СВЕТЛАЙ КРЫНІЦЫ

Напрыканцы траўня на тэрыторыі філіяла Літаратурнага музея Якуба Коласа ў Смольні, паблізу славутай Мікалаеўшчыны, адбылася сустрэча ўдзельнікаў фестывалю юных музыкаў Беларусі з паэтамі, кампазітарамі, навукоўцамі, музейнымі работнікамі.

Мы, госці і ўдзельнікі свята, прыехалі з Мінска. Спачатку агледзелі філіял музея ў Акінчыцах — на ўскраіне Стоўбцаў, дзе ў простай хаце селяніна-лесніка 3 лістапада 1882 г. нарадзіўся Якуб Колас. Пасля паехалі ў Смольню. Па дарозе мы ўбачылі частку велічнага мемарыяльна-мастацкага комплексу "Шлях Коласа". У яго ўваходзяць скульптурныя кампазіцыі, зробленыя разьбярамі па дрэве, народнымі ўмельцамі з розных месцаў Беларусі. Тут найдзвоку многае з таго, што звязана з жыццём і творчасцю Якуба Коласа, правобразы герояў яго твораў. Выканана ўсё з вялікім майстэрствам і пакідае добрае ўражанне.

У Смольні нас сустрэлі чароўнымі беларускімі народнымі песнямі і танцамі калектывы мастацкай самадзейнасці. Гасцям урачыста паднеслі духмяны каравай.

Мне даводзілася часта бываць тут. Некалі месца выглядала бедна, навокал пустэча, стаяла маленькая, старая хатка, у якой праездамі бываў Якуб Колас у 1911 — 1914 гг., абуцвелы, занядбаны хлеў. Радавалі вока толькі ліпы, пасаджаныя паэтам у 1911 г., неўзабаве пасля выхаду з турмы. Цяпер месца непазнаўнальна змянілася. Адрамантаваны і рэстаўраваны хата і хлеў, адноўлена гумно, збудаваны спецыяльны двухпавярховы музейны будынак і службовы дом. Тэрыторыя сядзібы абнесена жывой агароджай. Пасаджаны пладовы сад, які цяпер прыгожа квітнее, расце мноства дэкаратыўных дрэваў, кустоў, кветак. Побач пасаджаны сасновы лес, які зараз вырас і аздабляе наваколле. Сядзіба выглядае надзвычай прыгожа. Такі плён працы супрацоўнікаў музея Якуба Коласа. Заўсёды з вялікай асалодай бываеш у гэтым чароўным месцы.

Спачатку адбылося ўрачыстае адкрыццё Памятнай дошкі, на якой паказаны момант першай сустрэчы Якуба Коласа і Янкі Купалы. Сустрэча і першае асабістае знаёмства адбыліся ўлетку 1912 года, калі Купала завітаў сюды. З таго часу ўсталявалася братняя дружба паміж вялікімі паэтамі, якая доўжылася ўсё жыццё.

Памятная дошка выканана вядомым беларускім скульптарам Львом Гумілеўскім, які прысутнічаў на адкрыцці. Перад удзельнікамі свята выступілі старэйшы беларускі паэт Сяргей Грахоўскі, патрыярх беларускіх кампазітараў Анатоль Багатыроў, паэт Артур Вольскі, пісьменнік Іван Курбека, заслужаны дзеяч культуры Даніла Міцкевіч, паэтка з Масквы Ніна Салаўёва, маскоўскі кампазітар Міхаіл Пратасаў, які выканаў створаную ім песню. Пасля парадавалі сваімі выступленнямі музычныя калектывы. З вялікім задавальненнем і асалодай мы глядзелі і слухалі гэта цудоўнае відовішча. Цяжка вызначыць лепшых. Усё было цікавым, паказваліся лепшыя ўзоры народнай творчасці. Запомніліся выступленні ансамбля народнай музыкі "Пацешкі" з Маладзечанскага раёна, "Каласкі" з Коласава, фальклорны дзіцячы ансамбль з Любані "Хажаўляпка", сямейны ансамбль Сальнікавых з Радашковічаў, самадзейнікі-землякі Коласа з Стаўбцоўшчыны. Паказвалі сваё майстэрства калектывы з усіх абласцей Беларусі. Трэба адзначыць, што свята выйшла за межы нашай дзяржавы. У ім прынялі ўдзел калектывы з Уладзімірскай і Калінінградскай абласцей Расіі, з Ровенскай вобласці Украіны.

Вельмі добрае ўражанне пакінулі два духавыя маладзёжныя аркестры з Уладзімірскай вобласці. Яны выступалі на ўзроўні прафесіяналаў.

Прыемна адзначыць, што фестываль юных музыкаў праходзіў пад дэвізам славутай паэмы Якуба Коласа "Сымон-музыка". Геніяльная паэма дагэтуль — непераўзыдзеная вяршыня беларускай паэзіі. І не толькі беларускай. Аўтар прысвяціў паэму беларускай моладзі. Таму і знамянальна, што яна стала дэвізам свята. Ды і пісалася тут, у мемарыяльнай хаце філіяла.

Выступленні музыкаў робяць незабыўнае ўражанне. Гэта як глыток з чыстай, светлай крыніцы. Цяпер на нас абрынулася навала паскудства, якое запаланіла экраны тэлевізараў, радыё, эстраду. Музыкай назваць такую брыдоту ніяк не выпадае. Тым больш прыемна бачыць і чуць светлае, прыгожае, чыстае, высакароднае, створанае народам за многія вякі.

Фестываль праходзіць пяты раз. Хочацца пажадаць, каб ён доўжыўся многія і многія гады, і выказаць сардэчную ўдзячнасць арганізатарам цудоўнага свята — загадчыку аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама Анатолю Васільевічу Грэкаву, чалавеку натхнёнаму, арганізаванаму, няўрымслівому, і дырэктару Літаратурнага музея Якуба Коласа Зінаідзе Мікалаеўне Камароўскай.

Валянціна
ПАЛІКАРПОВІЧ,
музыказнаўца.

Фота А.ФЕДАРЭНЧЫКА.

Арахаўскі сельскі клуб — адзін з самых папулярных у Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці. Тут працуюць тры фальклорныя калектывы, вакально-інструментальны ансамбль, аматарскія аб'яднанні "Гаспадынька" і "Папрадуха". Ёсць тут і свой самадзейны тэатр.

ПА ЗДЫМКУ: у многіх спектаклях самадзейнага тэатра ўдзельнічаюць муж і жонка ТАРАСЮКІ. Вячаслаў — механік мясцовага калгаса "Зара", Марыя Сяргееўна — настаўніца пачатковых класаў Арахаўскай сярэдняй школы.

Фота Эдуарда КАБЯКА, БЕЛІНФАРМ.

"Купальскі вянок" — так называецца экспазіцыя народнай творчасці, якая адкрылася ў Цэнтры фальклору "Белая дача". Яна створана сумеснымі намаганнямі Саюза майстроў народнай творчасці Беларусі і народнай студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Чарадзеі" Цэнтра культуры чыгуначнікаў і прысвечана Міжнароднаму фестывалю фальклору, які пройдзе ў Беларусі ў чэрвені.

ПА ЗДЫМКУ: В.КУРГАНАЎ. Піано. (Разьба па дрэве).

Фота Яўгенія КАЗЮЛІ, БЕЛІНФАРМ.

Музычная школа, што ў вёсцы Чэрні Брэсцкага раёна — адна з лепшых у краіне. Калі сто хлопчыкаў і дзяўчынак з навакольных вёсак знаёмяцца тут з музыкай. Акрамя класічнага фартэпіяна, яны асвойваюць баян, скрыпку, гітару, цымбалы. Навучэнцы школы — пераможцы ўдзельнікі ўсіх конкурсаў і канцэртаў самадзейнага мастацтва, што праводзяцца ў раёне.

ПА ЗДЫМКУ: вось у такім прыгожым будынку размясцілася Чарнінская школа. Яго перадаў дзецям мясцовы калгас "Маладая гвардыя".

УПЕРШЫНЮ Ў БЕЛАРУСІ

МІЖНАРОДНЫ ДЖАЗАВЫ ФЕСТЫВАЛЬ

Упершыню ў сталіцы Беларусі, у Вялікай зале філармоніі, адбыўся Міжнародны джазавы фестываль "Мінск-1994". На працягу некалькіх дзён мінчане—аматары джазавай музыкі — знаёміліся з цікавымі прафесійнымі выканаўцамі, салістамі-інструменталістамі, спевакамі, малымі джазавымі калектывамі — квінтэтамі, квартэтамі — і вядучымі джаз-аркестрамі СНД. З'ехаліся і шматлікія госці з Швецыі, Бельгіі, Ізраіля, Францыі. Усё складвалася па-святочнаму, радасна.

Народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка прадставіла арганізатараў і фундатараў фестывалю. А адкрыў яго мэр Мінска Аляксандр Герасіменка.

Прадстаўнік Маскоўскай джазавай асацыяцыі, народны артыст Расіі, кампазітар Юрый Саульскі цёпла павіншаваў беларускіх слухачоў з пачаткам першага фестывалю. Пасля ўсіх забаронаў джаз пачаў сваё імкнутае месца, выкрываючы новыя невычэрпныя магчымасці джазавага музычнага мастацтва.

Канцэрт адкрыў арганізатар фестывалю, Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Міхаіла Фінберга. Галоўнае выступленне першага дня было прадастаўлена праслаўленаму Маскоўскаму джаз-аркестру пад кіраўніцтвам нязменнага дырыжора, народнага артыста Расіі Алега Лундстрэма. Упершыню ў гісторыі музычнага мастацтва Алег Леанідавіч Лундстрэм за нязменнае шасцідзесяцігадовае кіраўніцтва джаз-аркестрам занесены ў Кнігу Гінеса. У выкананні аркестра прагучалі шматлікія джазавыя п'есы, разнастайныя песні, выдатныя аранжыроўкі, кампазіцыі Алега Лундстрэма, Юрыя Саульскага, Юрыя Парфёнава, у тым ліку "Расцвітае боз", "Люстэрка" і шмат іншых.

Салісты аркестра, майстры высокага класа — трубачы, трамбаністы, саксафаніст Іван Голтаў, піяніст Міхаіл Окунь, віртуоз трубы кампазітар Юрый Парфёнаў з бляскам выканалі свае тэхнічныя імправізацыі пад буйныя апладысменты залы. Уладальніца прыгожага голасу спявачка Святлана Рубініна з вялікім пачуццём выканала старадаўні рускі раманс "Не ад'езджай" і некалькі джазавых песень у рытме "Свінга". Госць са Швецыі кампазітар Лас Шостан з аркестрам выразна выканаў на фартэпіяна сваю кампазицыю, прысвечаную гітарысту, спявак Руна Карлсан праспяваў некалькі папулярных джазавых песень, у тым ліку "Саксафон". Вакальны квартэт "Масква-Транзіт" выканаў шэраг рытмічных джазавых песень, паказаў яркую па прыгажосці гарманічную вакальную выканаўчую культуру. У заключэнне салісты і аркестр Лундстрэма, абыгрываючы славутую мелодыю Дзюка Элінгтона, паказалі высокую джазавую музычную культуру ўсіх артыстаў.

Канцэрт адкрыцця фестывалю працягваўся без антрактаў амаль тры гадзіны, гледачы, задаволеныя цудоўнай музыкай, пакідалі залу.

Другі дзень фестывалю. Зала запоўнена цалкам. Выступае Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Аркестр правёў шмат канцэртаў у Рэспубліцы, вядзе вялікую асветніцкую работу, удзельнічае ў шматлікіх фестывалях песні ў Віцебску, Маладзечне.

Гучаць аркестравыя п'есы "Вішнёвы сад", класіка джаза, кампазіцыі "Проста кадрыль", "Апошняе сказанне", "Мастацтва блюза". Салісты аркестра Заслужаныя артысты Беларусі Валерый Шчарыца і Валерый Дайнека, артысты Ігар Голікаў, Віталь Барма, Генадзь Грачуха дэманструюць рэдкае прафесійнае майстэрства.

Гледачы з захапленнем прынялі два малыя джазавыя ансамблі з аркестра: ансамбль Ігара Сацэвіча выканаў "Яблыневы чай" і "Няўдалую паездку" і Беларускі джаз-ансамбль Барыса Берштэйна, які выканаў у джазавай апрацоўцы беларускія народныя танцы "Бульба" і "Лявоніха". У фестывалі прынялі ўдзел маскоўскія малыя джазавыя аркестры-ансамблі: квартэт "Зялёная хваля", вакальны ансамбль "Дайт-Джэт", Брыль і "Новае пакаленне", трыо — Германа Лук'янава, Літоўскі джаз-квінтэт Апусаўскаса і Трыо Дані Гот Фрыда з Ізраіля.

Трэці канцэрт фестывалю адкрыў джаз-аркестр Лукс Бенд пад кіраўніцтвам выдатнага дзеяча джаза, кампазітара, дырыжора бігбендаў Анатоля Крола. Насычаная, складная разнастайная вялікая праграма аркестра была цікавай, выкананыя творы гучалі бездакорна чыста, з тонкімі нюансамі, прыгожымі кантрастамі аркестравых груп. Выдатныя спевакі Святлана Панова, Наталля Кудраўцава, мінчанка Маша Тарасевіч і Юрый Шыхін дастойна ўпрыгожылі канцэрт аркестра, і ў сваіх песнях паказалі віртуознае джазавае вакальнае майстэрства.

Гледачы ў час выканання твораў узнагароджвалі бурнымі апладысментамі майстроў духавога мастацтва: трубача Аляксея Касічэнку, саксафаніста Аляксея Мікаласва, ударніка Юрыя Гішбачова, а таксама віталі вакальны квінтэт "Сінкерс".

Заключны акорд канцэрта з бляскам прагучаў у п'есе Джонса "Для Вас" у зводным аркестры з салістамі двух джазаў пад кіраўніцтвам дырыжораў Анатоля Крола і Міхаіла Фінберга. Музычная грамадскасць Мінска з радасцю вітала канцэрты фестывалю і чакае новых знаёмстваў з артыстамі джазавай музыкі.

Барыс ПЯНЧУК,
народны артыст Беларусі,
прафесар Акадэміі музыкі.

МАГІЛЁЎСКІ ПЕДАГАГІЧНЫ КАЛЕДЖ

АБ'ЯЎЛЯЕ

ПРЫЁМ НАВУЧЭНЦАЎ НА ДЗЁННАЕ АДДЗЯЛЕННЕ НА 1994-95 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

На базе сярэдняй школы:

0402 "Настаўнік пачатковых класаў" (навучанне па праграме каледжа).

0401 "Дашкольнае выхаванне" (навучанне па праграме каледжа).

Тэрмін навучання 2 гады 10 месяцаў.

Навучанне па праграме каледжа прадугледжвае пасля заканчэння прадаўжэнне адукацыі ў інстытуце са скарочаным тэрмінам навучання па дзённай і завочнай форме.

0401 "Дашкольнае выхаванне". Тэрмін навучання 1 год 10 месяцаў.

На базе дзевяцігадовай школы:

0402 "Настаўнік пачатковых класаў". Тэрмін навучання 3 гады 10 месяцаў.

0401 "Дашкольнае выхаванне". Тэрмін навучання 3 гады 10 месяцаў.

Прыём заяў з 15 чэрвеня па 31 ліпеня.

Уступныя экзамены з 1 жніўня.

Залічэнне ў лік навучэнцаў да 20 жніўня.

Абітурыенты здаюць наступныя экзамены:

Па спец. 0402 (каледж) на базе сярэдняй школы — па беларускай мове (дыктант), матэматыцы (вусна).

Па спец. 0401 (каледж) на базе сярэдняй школы; 0401 на базе сярэдняй школы — па беларускай мове (дыктант), біялогіі (вусна).

Па спец. 0401 і спец. 0402 на базе дзевяцігадовай школы — па беларускай мове (дыктант), матэматыцы (вусна).

Асобы, якія не вывучалі беларускую мову, пішуць дыктант на рускай мове.

Парадак залічэння:

Без уступных экзаменаў залічваюцца асобы, якія закончылі базавую (дзевяцігадовую) школу з адзнакай, сярэднюю школу з залатым або сярэбраным медалём, прафесійна-тэхнічнае вучылішча на базе дзевяцігадовай школы з дыпломам з адзнакай.

На падставе вынікаў субяседавання прымаюцца асобы, якія закончылі сярэднюю школу, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы на базе дзевяцігадовай школы з адзнакамі "4" і "5", якія паступаюць па спецыяльнасці 0401 "Дашкольнае выхаванне" на базе сярэдняй і базавай школы.

Залічэнне вышэйназваных катэгорый праводзіцца за пяць дзён да пачатку ўступных экзаменаў у межах 60% плана прыёму. Пры наяўнасці конкурсу сярод іх праводзіцца з імі першы ўступны экзамен (па беларускай мове — дыктант). Незалічаныя асобы здаюць другі экзамен і залічваюцца па конкурсу.

Пералік дакументаў да падачы ў прыёмную камісію:

заява аб дзевяцігадовай ці сярэдняй адукацыі ў арыгінале, медыцынская даведка па форме № 086-у; чатыры фотакарткі памерам 3х4; выпіска з працоўнай кніжкі або кніжкі калгасніка, заверана адміністрацыяй (падаецца тымі, хто мае стаж практычнай работы); характарыстыка; для мэтавікаў — накіраванне.

Пашпарт (пасведчанне аб нараджэнні), дакумент аб адносінах да воінскай павіннасці прад'яўляюцца асабіста.

Асобы, якія маюць недахопы мовы, касавокасць, не прымаюцца.

Адрас каледжа: 212030, Магілёў, вул. Камсамольская, 18. Даведкі па тэлефоне: (0222) 25-72-13.

Што паглядзець па тэлебачанні ў нядзелю 12 чэрвеня

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Пад купалам Сусвету. 8.20 Слова да чалавека. 8.55 "Чаранішкі нідзе". Мультфільм. 9.30 "Пірэ Валтасара, або Ноч са Сталінім". Мастацкі фільм. 11.00 Рэтро. 11.05 MTV. Лепшыя хіты. 11.40 Тэлескрама. 11.55 20 мінут рэдактара. 12.15 Для школьнікаў. Пра шахматы і шахматыстаў. Вядучая — міжнародны гросмайстар К.А.Зазрыкіна. Заключны тур. 13.00 Трыбуна кандыдатаў у прэзідэнты. 15.00 "Усе мы родам з дзяцінства". Фінал I Рэспубліканскага тэлефестывалю юных талентаў. Перадача 2-я. 16.15 "Планета людзей". Міжнародная праграма. 16.55 Чэмпіянат Еўропы па гандболу. Фінал. Трансляцыя з Партугаліі. Прамое ўключэнне. 18.30 "Дзівосная бочка". Мультфільм. 18.40 "Гінес-шоу". 19.10 Дыялог у прямым эфіры. На пытанні тэлегледачоў адказвае доктар філасофскіх навук, прафесар І.І.Антанові. 20.00 Панарама. 20.35 Пяць хвілін на жарты. 20.40 Калыханка. 21.00 "Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар". 21.10 Урачыстае закрыццё Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладэчна-94". 23.30 "Каскад". Ад спадарожніка да тэлевізара. 23.40 Відэльма-навідэльма. Навіны кіна-відэаўдыё. 0.40 Пад купалам Сусвету.

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

7.00, 17.15, 23.10 Навіны. 7.25 Маладзі аркестры Расіі. 8.05 Раным-рана. 8.35 Марафон-15. 9.05 Палігон. 9.35 Тыраж "Спорткато". 9.50 Пакуль усе дома. 10.20 "З вёсам аб вёсе..." Музычная праграма. 11.05 "У крузе першым". Мастацкі фільм (Францыя). 2-я серыя. 13.00 "Піф і Геркулес". Мультсерыял. 13.10 Дакументальны серыял "Падводная адысея каманды Кусто". 14.00 Дзень Расіі. Перакліч гарадоў. 14.40 "Грай, гармонік!" 15.25 Шпаргалка. 15.30 "Кот Фелікс", "Сапраўдныя палявічкі на прывідаў". Мультфільмы. 16.25 Сакраты актрысы. Таццяна Пельцар. 17.25 Тэлеколцы. 17.40 Падвор'е. 17.45 "Удачы вам, панове". Кінакамедыя. 19.35 "Зоркі Расіі". Святочны канцэрт на Пятрыкрышых сажалках. 21.10 Нядзеля. 21.55 Спартыўны фік-эпід. 22.10 Брава. Хрустальная Турандот. 23.20 Астралябія.

КАНАЛ "РАСІЯ"

8.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі. 7.25 Мульці-пульці. "Хлопчык і дзяўчынка". 7.35 "Танцоры". Дакументальны фільм. 8.05 Студыя "Рост". 8.35 Добрай раніцы, Еўропа. 9.05 Лешыя гульні ІІБА. 10.05 Аты-баты... 10.35 Цяжкі ўзрост. 10.55 "Прыгоды Электроніка". Мастацкі фільм. 2-я серыя. 12.00 "Кветкі Расіі". Святочная канцэртная праграма. 13.20 Не высечы... 13.35 Кінатэатр паўторнага фільма. "Хлопец з нашага горада" 15.15 Каробка перадач.15.30 Песні рускай арміі. 16.00 Валейбол. Сусветная ліга. Расія—Кітай. 16.35 Чароўны свет Дысней. "Гуфі і яго каманда", "Чорны пляшч". 17.35 "З жыцця Фёдара Кузькіна". Мастацкі фільм. 1-я серыя. 19.25 Свята кожны дзень. 19.35 "З жыцця Фёдара Кузькіна". Мастацкі фільм. 2-я серыя. 21.15 Валейбол. Сусветная ліга. Расія—Кітай. 21.45 У Ксюшы. 22.40 Аўтаімгненне. 22.45 Зоркі гавораць. 22.50 Спартыўная карусель. 22.55 Чэмпіянат свету па аўтагонках. "Формула-1". Гран-пры Канады. Перадача з Манрэаля.

Галоўны рэдактар Алег КУЛІЦКІ.

ЗАСНАВАЛЬНІК — МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выдавецтва "Полымя" (220004, Мінск, праспект Машэрава, 11).

НАШ АДРАС:
220034, МІНСК, ВУЛІЦА ЗАХАРАВА, 42.
Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 36-91-42; першага намесніка галоўнага рэдактара — 36-40-63; намесніка рэдактара-адказнага сакратара — 36-53-22; аддзелаў: праблем выхавання — 36-43-62, 36-41-55; школ — 36-90-63; органаў кіравання — 36-43-71; сацыяльных праблем; ВНУ і тэхнікумаў — 36-41-55; прафтэхадукацыі; пісьмаў і навін; культуры — 36-44-25

Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па-бацьку, зваротны адрас, нясуць адказнасць за дакладнасць фактаў і іншай інфармацыі.

Пісьмы, рукапісы, фотаздымкі і малюнкі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Меркаванне аўтараў публікацый не абавязкова адлюстроўвае пункт гледжання рэдакцыі.

Адказны дзяжурны Георгій КЛЯБАНАЎ.

Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку."
220041, Мінск, праспект Ф. Скарыны,79.
Аб'ём — два друкаваныя аркушы. Спосаб друку — афсетны.Фармат А2. Індэкс 63867.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 Замова №49
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Падпісана да друку 7.6.94 г. у 18.10
Наклад 45.096 паасобнікаў.